Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

14 КРАСАВІКА 2017 г. ПЯТНІЦА № 71 (28435)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Рэцэпты ад паслоў і дыпламатаў**

СТАР. 5



**Пра важнасць зваротнай сувязі**

СТАР. 16



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аркадзь ДВАРКОВІЧ, віцэ-прэм'ер Расіі:**

*«На аснове ўзаемнага даверу, разумення агульных стратэгічных інтарэсаў мы змаглі знайсці агульныя падыходы і пасля сустрэчы прэзідэнтаў дзвюх краін у Санкт-Пецярбургу цалкам урэгулявалі наяўныя праблемы. У хуткім часе будуць падпісаны камерцыйныя дакументы ў газавай сферы, якія дазволяць адысці ад праблем у наступныя гады».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.04.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8865 | ▼ |
| Еўра | 2,0087 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0333 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0702 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# РАНІЦА НА ТРУСІНАЙ ФЕРМЕ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Былы трактарыст, жыхар вёскі Дзікева Шаркаўшчынскага раёна Іван КУЧАРАВЫ ўжо некалькі гадоў дапамагае невялікай трусінай ферме, якая належыць аддзяленню кругласутачнага знаходжання для пажылых і інвалідаў пры раённым Цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Кожную раніцу і вечар Іван Пятровіч прыходзіць да сваіх гадаванцаў, даглядае іх, корміць, прыбірае.**

**Цяпер на міні-ферме знаходзяцца шэсць дзясяткаў вушасцікаў, але ў летні час пагалоўе жывёл значна ўзрастае.**

■ Спецыяльны рэпартаж

## «ВАКАНСІІ ГРУЗЧЫКАЎ УЖО РАЗАБРАЛІ»

### Што могуць прапанаваць раённыя камісіі па працаўладкаванні?

**З канца сакавіка ў раёнах пачалі дзейнічаць камісіі па працаўладкаванні. Кожны будны дзень кіраўніцтва выканкама, спецыялісты службы занятасці і начальнікі прадпрыемстваў вядуць прыём — разбіраюцца ў складаных жыццёвых сітуацыях і спрабуюць падабраць грамадзянам падыходзячыя вакансіі. Што часам няпроста: адных не бяруць за прагулы, у іншых няма кваліфікацыі...**

**За работай такой камісіі мы паназіралі ў Барысаўскім раёне, дзе ледзь не самая вялікая напружанасць на рынку працы — на адну вакансію прэтэндуе амаль чатыры чалавекі.**

СТАР. 4



У чаканні работы.

Фота Надзеі БУЖАН.

■ Трансгранічны турызм

## ПІКНІК ПА-БЕЛАРУСКУ

### Свята на памежжы адкрые сезон вандровак па Аўгустоўскім канале

**Мерапрыемствы пройдуць па абодва бакі — у Беларусі і Польшчы. Арганізатары праграмы назвалі яе вялікім трансгранічным пікнікам, які пачнецца 29 красавіка і працягнецца да 1 мая.**

**З першага дня свята пашырацца магчымасці і для турыстаў. Мяжу можна будзе перасякаць не толькі па вадзе, але і сухапутным шляхам — пешшу альбо на веласіпедзе.**

### Разбудзіць канал

Апошні красавіцкі ўік-энд дасць старт новаму турыстычнаму сезону. Месцам збору, як заўсёды, будзе тэрыторыя шлюза Дамброўка, аднаго з чатырох, размешчаных на беларускай частцы канала. Каб канал прачнуўся, тут будзе шумна і весела. Свята ўжо стала традыцыйным, з конкурсамі, забавамі, канцэртам. У праграме нямала розных кулінарных шоу: паяданне дранікаў, арыгінальны рэцэпт «бабінай кашы», дэгустацыя шляхецкай і сялянскай кухні. У госці да беларусаў запрошаны і польскія суседзі.

Дарэчы, яны таксама ў гэты дзень ладзяць сваё свята на канале, якое пройдзе каля памежнага шлюза Кужынец. Таму масавыя сустрэчы ўпершыню адбудуцца як па адзін, так і па другі бок. Плануецца правесці шэраг сумесных спартыўных і культурных конкурсаў, сяброўскіх сустрэч. Трансгранічны пікнік зможа наведаць любы ахвотны. Святочнай праграмай, якая будзе доўжыцца тры дні, з беларускага боку займаецца Гродзенскі райвыканкам. У аддзеле ідэалогіі, культуры і па справах моладзі расказалі, што ў гэты дзень будуць катаць на брычцы, а яшчэ паведуць па экскурсійным маршруце з наведваннем дотаў і музея гісторыі Аўгустоўскага канала. Музей, створаны ў былым доміку наглядчыка канала, пачаў працаваць у мінулым годзе, а сёлета папоўніцца новымі экспанатамі.

СТАР. 3

# ЛАКАМАТЫЎ — МІЖРЭГІЯНАЛЬНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

## Кітайская правінцыя Хунань будзе развіваць адносіны з Магілёўскай вобласцю

**Гэты месяц багаты на візіты дэлегацый з Паднябеснай. Нядаўна ў Палацы Незалежнасці былі кіраўнікі праваахоўнай сферы Кітая, у пачатку наступнага тыдня да нас завітае прадстаўнічая парламенцкая дэлегацыя. А ўчора кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з сакратаром камітэта Камуністычнай партыі Кітая Правінцыі Хунань Ду Цзяхаа.**

Трэба сказаць, што і ў гісторыі Кітая, і ў сусветнай гісторыі правінцыя Хунань займае асаблівае месца. Менавіта там, у вёсцы Шаашань, у сялянскай сям'і нарадзіўся Маа Цзэдун, адзін з самых вядомых палітычных дзеячаў мінулага стагоддзя, чыё імя шануецца ў Кітаі і ў наш час.

— Сёння, пад вашым кіраўніцтвам, гэты ўжо не толькі аграрны, але і значны індустрыяльны рэгіён Кітая паспяхова развіваецца, знаходзіцца на перадавых пазіцыях у краіне, — адзначыў Прэзідэнт.

Таму, на яго думку, не дзіўна, што ў правінцыі Хунань з'явіліся кропкі судакранання з Беларуссю:

— Два гады таму мы з маім сябрам Сі Цзіньпінам дамовіліся пра тое, што міжрэгіянальнае ўзаемадзеянне павінна стаць лакаматывам у адносінах дзвюх краін. Ваша правінцыя атрымала надзейнага партнёра ў асобе Магілёўскай вобласці і актыўна працуе з ёю. Буду ўсяляк падтрымліваць гэтыя кантакты нашай вобласці з вашай правінцыяй. Таму на сённяшняй сустрэчы хацелася б больш шырока абмеркаваць аспекты супрацоўніцтва як з гэтым рэгіёнам, так і з Беларуссю ў цэлым.

Кіраўнік дзяржавы назваў некалькі перспектыўных кірункаў для развіцця адносін з правінцыяй:

— Па-першае, мы зацікаўлены ў паспяховай рэалізацыі тых кантрактаў, якія мы сёння маем, — перш за ўсё, з кампаніяй «Зумліон». У лютым бягучага года ў свабоднай эканамічнай зоне «Магілёў» ужо зарэгістравана беларуска-кітайскае прадпрыемства па выпуску спецтэхнікі — будаўнічай, камунальнай. На заводзе «Строммашына» рыхтуюцца да сумеснай зборкі кранавага абсталявання. Мы спадзяёмся, што кампанія «Зумліон» будзе годна працаваць і ў індустрыяльным парку «Вялікі камень». З улікам прадастаўленых намі льгот тут яна можа хуткімі тэмпамі наладзіць высокатэхналагічную вытворчасць, і гэта прадукцыя будзе карыстацца попытам не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі, у Еўразійскім саюзе.

Па-другое, адзначыў кіраўнік дзяржавы, у нас ёсць магчымасць павялічыць пастаўкі ў кітайскую правінцыю харчовай, перш за ўсё, малочнай прадукцыі з Магілёўскай вобласці.

— Па чыгунцы праз Беларусь у Еўропу ўжо ідуць кітайскія кантэйнеры з грузамі, якія назад вяртаюцца паўпустымі. Беларускія прадпрыемствы маглі б загрузіць іх якасным малаком, ёгуртамі, марожаным, попыт на якія ў Кітаі расце літаральна з кожным днём. Кампанія «Бабуліна крынка» гатова забяспечыць вашы патрэбы.

Па-трэцяе, на думку кіраўніка дзяржавы, неабходна наладжваць больш цесныя сувязі ў сферах культуры і адукацыі:

— Улічваючы, што беларускія творчыя калектывы карыстаюцца папулярнасцю ў Кітаі, можна арганізаваць іх гастролі ў вашай правінцыі Хунань. Думаю, парасткі сяброўства паміж нашымі народамі важна закладваць з дзіцячых гадоў. Адпаведны фармат для гэтага — культурны абмен навучэнцамі з пражываннем у сем'ях у перыяд летніх канікул. У школах Беларусі выкладаюць кітайскую мову, у Кітаі — рускую, англійскую. Дзеці хутка адаптуюцца, знаходзяць узаемаразуменне. Гэта будзе цікава і карысна. Як бачым, у нас ёсць вялікі патэнцыял для ўзаемадзеяння ў сферах адукацыі, гандлю, вытворчасці, культуры. Каб эфектыўна яго рэалізаваць, прапаную вам адкрыць прадстаўніцтва правінцыі Хунань у Рэспубліцы Беларусь.

Ду Цзяхаа, у сваю чаргу, назваў Беларусь галоўным партнёрам Кітая ў цэлым і правінцыі Хунань у прыватнасці.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

### ДАРЭЧЫ

Візіт сакратара камітэта КПК правінцыі Хунань працягнецца да 16 красавіка. Праграмай прадугледжана наведванне вытворчасцяў МАЗ, «Белджы», «БелАЗ», індустрыяльнага парка «Вялікі камень». Ду Цзяхаа наведае і Магілёў, дзе сустрэнецца са старшынёй аблвыканкама Уладзімірам Даманеўскім. Плануецца падпісанне Пагаднення аб устанаўленні сяброўскіх адносін паміж Магілёўскай вобласцю і правінцыяй Хунань, наведванне завода «Магілёўтрансмаш», «Бабулінай крынкі», булачна-кандытарскай кампаніі «Дамачай», свабоднай эканамічнай зоны «Магілёў».

# СЯРОД ПЕРШЫХ У СВЕЦЕ

## Наша краіна можа перамагчы СНІД першай ва Усходняй Еўропе

**У многім беларуская медыцына з'яўляецца ўзорнай. Адным з самых яскравых прыкладаў гэтага можна назваць той факт, што наша дзяржава стала адной з першых у рэгіёне і свеце, якая пацвердзіла летась выключэнне перадачы ВІЧ ад маці да дзіцяці і атрымала адпаведны сертыфікат Сусветнай арганізацыі аховы здароўя.**

Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з выканаўчым дырэктарам Аб'яднанай праграмы ААН па ВІЧ/СНІДу (ЮНЭЙДС) Мішэлем Сідзібэ.

— Перш за ўсё хачу выказаць вам удзячнасць за тую каласальную дапамогу і падтрымку, якую вы аказвалі нам у галіне аховы здароўя, асабліва ў барацьбе з такой страшнай хваробай, як ВІЧ/СНІД, — сказаў кіраўнік дзяржавы напачатку сустрэчы. — Дзякую вам за тую ацэнку, якую вы даяце Беларусі ў рабоце па пераадоленні гэтай хваробы. Скажу вам шчыра, калі б не было вашай падтрымкі ў барацьбе з гэтай хваробай, мы ніколі б не дабіліся такіх вынікаў.

Прэзідэнт нашай краіны асабіста ўручыў Мішэлю Сідзібэ высокую дзяржаўную ўзнагароду — медаль Францыска Скарыны.

— За той велізарны ўнёсак, які вы зрабілі ў ахову здароўя Беларусі, — аргументаваў кіраўнік дзяржавы.

Прадстаўнік ААН падзякаваў Прэзідэнту за яго лідарскую пазіцыю, дзякуючы якой дзяржава змагла так прасунуцца ў барацьбе з хваробай. Ён падкрэсліў: Беларусь дэманструе, што ўжо новае пакаленне можа быць народжана без праблемы СНІДу і ВІЧ-інфекцыі. Увесь свет да гэтага ішоў вельмі доўга.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

### У тэму

**Васіль ЖАРКО, намеснік прэм'ер-міністра:**

— Мэта адна — каб новае пакаленне расло без ВІЧ/СНІДу, і ўся наша работа ў сістэме аховы здароўя, грамадскай бяспекі нацэлена на гэта. Больш за 20 гадоў мы супрацоўнічаем з ЮНЭЙДС. Сапраўды, дзякуючы іх падтрымцы краіна змагла дасягнуць высокіх вынікаў. У нас ідзе яўнае, не фармальнае, а сапраўды аб'ектыўнае зніжэнне і выяўляемасці, і смяротнасці ад СНІДу. Наша краіна першая на еўрапейскім кантыненце атрымала сертыфікат, які пацвярджае, што ў краіне спынена перадача ВІЧ/СНІДу ад маці да дзіцяці.

### Знак якасці

# Дзяржаўныя прэміі атрымалі 10 прадпрыемстваў

**Учора ў Мінску ў Нацыянальнай бібліятэцы адбылася цырымонія ўзнагароджання пераможцаў конкурсу на саісканне Прэміі Урада за дасягненні ў галіне якасці 2016 года. У мерапрыемстве прыняў удзел прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ.**



Фота БЕЛТА.

— Камісія па прысуджэнні Прэміі Урада за дасягненні ў галіне якасці прыняла рашэнне аб прысваенні звання лаўрэата 2016 года дзесяці арганізацыям рэспублікі, — адзначыў Андрэй Кабякоў. — Пацвердзілі званне лаўрэата 16 арганізацый, адна стала дыпламантам конкурсу, тры ўдастоены спецыяльных узнагарод.

Уладальнікамі прэміі сталі: «Аўгуст-Бел», «Бабуліна крынка», «Брэсцкі мясакамбінат», «Завод горнага воску», «Лунінецкі малочны завод», «Маладзечанскі малочны камбінат», «Навагрудскі завод газавай апаратуры», «Полацк-Шкловалакно», «Конус» і Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна.

— Ацэнка на адпаведнасць крытэрыям Прэміі Урада — гэта ацэнка таго, наколькі прадпрыемства гатова працаваць у заўтрашнім дні, — падкрэсліў **старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Віктар НАЗАРАНКА.** — І наколькі прадпрыемства ўжо сёння дасягнула пэўных вынікаў. Для дасягнення гэтай тысячы балаў — максімальна магчымай ацэнкі — трэба шмат чаго зрабіць. Як правіла, большасць нашых арганізацый, якая лаўрэаты конкурсу, працуюць на планцы 700—750 балаў.

На яго думку, гэта сведчыць аб тым, што ў кожнага прадпрыемства ёсць аспекты, у якіх неабходна ўдасканальвацца.

У 2016 годзе конкурс быў праведзены 18-ы раз. За мінулы час яго лаўрэатамі сталі 213 найлепшых арганізацый. Званне лаўрэата Прэміі забяспечвае прадпрыемству рэпутацыю надзейнага вытворцы прадукцыі, спрыяе пашырэнню рынкаў збыту і адкрывае новыя дзелавыя магчымасці.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

### Добрая навіна

# Спартыўны комплекс для Краснаполля

**У адкрыцці стратэгічна важнага для раёна аб'екта ўдзел прыняў намеснік прэм'ер-міністра Анатоль КАЛІНІН.**

Першую чаргу фізкультурна-аздараўленчага комплексу — басейн з дзіцячым аквапаркам — урачыста ўвялі ў дзеянне яшчэ летась у красавіку. А зараз да паслуг жыхароў Краснапольшчыны і найбліжэйшых да яе раёнаў адкрыліся адразу некалькі залаў — шматфункцыянальны для гульнявых відаў спорту з трыбунамі на 390 месцаў, для заняткаў фітнесам і атлетычнай гімнастыкай, для заняткаў боксам і барацьбой.

— Раён вырашыў праблему не толькі з будаўніцтвам такога важнага для здароўя жыхароў аб'екта, але яшчэ і стварыў 27 новых працоўных месцаў, — адзначыў **начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму Краснапольскага райвыканкама Сяргей СЫРАНКОЎ.** — За год басейн і дзіцячы аквапарк наведала больш за 70 тысяч жыхароў Чэрыкаўскага, Чавускага, Слаўгарадскага раёнаў Магілёўскай вобласці, Чачэрскага і Кармянскага Гомельскай вобласці, Краснагорскага Бранскай вобласці. Тут праводзіліся абласныя і раённыя спаборніцтвы па плаванні сярод навучэнцаў, працоўных калектываў. А некалькі дзён таму на новай пляцоўцы прайшоў таварыскі матч па валейболе паміж камандамі Краснапольшчыны і Браншчыны, прысвечаны Дню яднання народаў Беларусі і Расіі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Трамп: сустрэчы Тылерсана ў Маскве скончыліся лепш, чым чакалася



Візіт дзяржсакратара ЗША Рэкса Тылерсана ў Расію прайшоў лепш, чым чакалася, заявіў амерыканскі прэзідэнт Дональд Трамп падчас сумеснай прэс-канферэнцыі з генеральным сакратаром НАТА Енсам Столтэнбергам.

«Усё прайшло даволі добра. Можа, нават лепш, чым чакалася», — заявіў Трамп. Ён дадаў, што цяпер ЗША і Расія «зусім не ладзяць» адно з адным. «Што датычыцца стасункаў з Расіяй, то мы, напэўна, знаходзімся на гістарычным мінімуме ў гэтых адносінах», — сказаў прэзідэнт ЗША.

«Пуцін — лідар Расіі. Расія — моцная краіна. Мы — вельмі-вельмі моцная краіна», — заявіў Трамп. Трэба пачакаць, каб зразумець, як далей складзецца супрацоўніцтва з Масквой, дадаў ён.

Таксама Трамп чарговы раз выказаўся з нагоды падзей у Сірыі. Як заявіў прэзідэнт ЗША, ён не хацеў бы думаць, што Расія загадзя ведала аб хімічнай атацы ў Сірыі.

### Берлін раскрытыкаваў прэс-сакратара Белага дома за параўнанне Асада з Гітлерам

Улады ФРГ лічаць недапушчальным выкарыстанае прэс-сакратаром Белага дома Шонам Спайсерам параўнанне прэзідэнта Сірыі Башара Асада з Адольфам Гітлерам. Пра гэта заявіў на брыфінгу ў Берліне афіцыйны прадстаўнік урада ФРГ Штэфен Зайберт.

«Любое параўнанне сучасных падзей са злачынствамі нацыянал-сацыялістаў не вядуць ні да чаго добрага, — сказаў ён. — Гэта недапушчальна».

Раней, у панядзелак, Спайсер, выступаючы на рэгулярным брыфінгу для журналістаў у Белым доме, заявіў, што, нягледзячы на ўсе жахі Другой сусветнай вайны, ЗША і Германія не ўжывалі ў ёй хімічную зброю. «Мы не выкарыстоўвалі хімічныя ўзбраенні ў той сусветнай вайне, і нават такому нягодніку, як Гітлер, не прыходзіла ў галаву ўжываць хімічныя ўзбраенні», — сказаў прэс-сакратар, каментуючы меркаванае выкарыстанне хімзброі ў сірыйскай правінцыі Ідліб, адказнасць за якое Вашынгтон усклаў на сірыйскія ўлады. Пазней у інтэрв'ю тэлекампаніі CNN ён прынёс прабачэнні за гэтае параўнанне.

### Прэм'ер Японіі папярэдзіў пра магчымую здольнасць КНДР запускаць ракеты з зарынам

Паўночная Карэя можа валодаць здольнасцю запускаць ракеты з боегалоўкамі, начыненымі нервова-паралітычным газам зарын, заявіў у чацвер, 13 красавіка, прэм'ер-міністр Японіі Сіндза Абэ. Разам з тым палітык выказаў асцярогу, што КНДР у хуткім часе можа правесці шостае ядзернае выпрабаванне ці новыя ракетныя запускі.

Сваю заяву з нагоды Паўночнай Карэі Абэ выказаў падчас пасяджэння парламента, паведамляе Reuters. «Існуе верагоднасць таго, што Паўночная Карэя ўжо мае магчымасць дастаўляць ракеты з зарынам у якасці боегаловак», — заявіў японскі прэм'ер. Агенцтва нагадвае, што ў 1995 годзе японская секта «Аум сенрыкё» здзейсніла шэраг тэрарыстычных нападаў у час пік у такійскім метро з распыленнем зарыну, у выніку чаго загінулі 12 чалавек.

Між тым у прэсе распаўсюджваецца інфармацыя, што КНДР ужо гатовая да правядзення новага ядзернага выпрабавання. Гэта можа адбыцца ў суботу, 15 красавіка, калі ў Паўночнай Карэі будзе адзначацца 105-я гадавіна з дня нараджэння заснавальніка КНДР Кім Ір Сена.

# ПІКНІК ПА-БЕЛАРУСКУ

## Бонус для турыста

Арганізатары адзначылі, што ў такім фармаце адкрыццё сезона праходзіць упершыню, бо для наведвання беларускай часткі канала замежным турыстам не патрэбны візы. Бязвізавая прастора займае зону парку «Аўгустоўскі канал» і частку Гродзенскага раёна згодна з указам №318 ад 26 кастрычніка 2016 года.

Дарэчы, трапіць на канал можна праз чатыры пункты пропуску, з якіх два — водныя і працуюць сезонна.

А сёлета замежныя турысты атрымаюць яшчэ адзін важкі бонус. Падчас свята на канале будзе адкрыты веласіпедны рух праз мяжу. Дагэтуль сезонны пункт пропуску «Лясная» (Беларусь) — «Рудаўка» (Польшча) быў толькі водным. Але цяпер уздоўж канала актыўна развіваецца веларух, з'явіліся маршруты, пракладзены веладарожкі, у тым ліку і па праграмах трансгранічнага супрацоўніцтва.

На адкрыцці турыстычнага сезона плануецца даць старт і новым веласіпедным маршрутам, агульная працягласць якіх складае амаль 50 кіламетраў. На дыстанцыі будуць стаяць указальнікі, знакі і карты-схемы маршрутаў. Аматары актыўнага адпачынку змогуць праехаць на веласіпедзе па дамбе і ўбачыць славутыя мясціны і аб'екты вакол яго.

Перасячы мяжу ў сезонным пункце пропуску змогуць таксама і пешыя турысты.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Уладзімір КРАЎЦОЎ, старшыня Гродзенскага аблвыканкама:**

— Чым бліжэй лета, тым больш гасцей прыязджае да нас з-за мяжы па бязвізавай схеме. Толькі за выхадныя бывае да 700 чалавек. Таму ў канцы года будзем звяртацца да кіраўніка дзяржавы з прапановай прадоўжыць дзеянне ўказа №318, якім устаноўлены бязвізавы парадак уезду на тэрыторыю Беларусі з турыстычнымі мэтамі на тэрмін да пяці сутак у спецыяльным турысцка-рэкрэацыйным парку «Аўгустоўскі канал» і прылеглых тэрыторыях. Для пашырэння турыстычных магчымасцяў хочам задзейнічаць чыгуначны і паветраны транспарт.

## Карабель плыве

Турысты-воднікі пачынаюць новы сезон міжнародным спартыўным фестывалем «Нёманская вясна». На яго збіраюцца прадстаўнікі Беларусі, Расіі, Польшчы, Украіны. Сёлета фестываль прайшоў на пачатку красавіка, а вось з 1 мая пачынае дзейнічаць сезонны пункт пропуску, праз які з Польшчы сюды плывуць турысты-байдарачнікі. Ва ўпраўленні спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама прагназуюць павелічэнне колькасці арганізаваных груп, асабліва з улікам бязвізавага рэжыму. Каб вандроўнікам было зручней, зімой падрыхтавалі неабходную інфраструктуру — на шлюзах пабудаваны прычалы, зроблены навесы, абсталяваны паходныя лазні, вогнішчы.

На гэтым тыдні на канале пачалася навігацыя. У свой першы рэйс пасля зімы адправіўся цеплаход «Нёман». Яго маршрут пачынаецца ў Гродне і завяршаецца на шлюзе Дамброўка, дзе адбываецца шлюзаванне. У дыстанцыі задзейнічаны рака Нёман і Аўгустоўскі канал. Як паведамілі на прадпрыемстве «Гроднамеліявадгас», першай групай сталі літоўскія турысты. І гэта не выпадкова, бо каля 65% бязвізавых гасцей — гэта менавіта грамадзяне Літвы. Яны ўсё часцей наведваюць рэгіён і Аўгустоўскі канал.

Што датычыцца водных прагулак, асобнага графіка не прадугледжана. Цеплаход будзе выходзіць у рэйс па заяўках. Некалькі гадзін у летні месяцы будзе выдзяляцца ў парадку жывой чаргі. У «Гроднамеліявадгасе» запэўнілі, што плата застанецца на ўзроўні мінулага года і складзе за рэйс 280 рублёў за гадзіну. Гэты кошт размяркоўваецца на кожнага ўдзельніка паездкі. Для «дзікіх» турыстаў цана складае 8 рублёў на чалавека. У дзень цеплаход можа зрабіць да 9—10 рэйсаў. Пакуль гэта адзінае пасажырскае судна на канале. Для турыстаў ёсць магчымасць узяць напракат лодку ці катамаран.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Сёлета на канале адбудуцца такія святы, як «Аўгустоўскі канал збірае сяброў» (27 мая), турыстычны злёт моладзі (18 ліпеня), веламарафон «Суседзі» (15 ліпеня), «Бітва дыджэяў» (15 ліпеня), фестываль шансона (29 ліпеня), «Свята мора», «Заплыў на чым папала» (12 жніўня), «Аўгустоўскі канал у культуры трох народаў» (26 жніўня), фестываль «Скарбы Гродзеншчыны» (9 верасня), водны марафон (22 верасня).**

■ Ацяпленне

## Кранікі адкруцяць назад

**Учора на Брэстчыне пачалі аднаўляць падачу цяпла ў жыллёвы фонд, паведамляе начальнік аддзела камунальнай гаспадаркі і энергетыкі Брэсцкага абласнога ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі Сяргей АНАНЬЕЎ.**

Абласны чыноўнік удакладніў, што ў дзіцячых садках, школах, бальніцах, паліклініках і іншых установах сацыяльнай сферы ацяпленне цалкам і не выключалі. Гэтыя аб'екты абаграваліся ў рэжыме працэплівання. Вядома, што Брэсцкая вобласць вырашыла адключыць ацяпленне ў жылфондзе ўжо з першых дзён красавіка. Тады і на дварэ было больш за 20 цяпла...

**Генеральны дырэктар дзяржаўнага аб'яднання «Жыллёва-камунальная гаспадарка Гомельскай вобласці» Дзмітрый ЗГУРСКІ** паведаміў, што ў іх рэгіёне ізноў пачнуць уключаць ацяпленне з 14 красавіка. Нагадаю, што падачу цяпла ў Гомельскай вобласці паспелі спыніць для ўсіх спажыўцоў. Таму з пятніцы тут пачнецца падача цяпла ў рэжыме працэплівання ў сацыяльных аб'ектах і дамах жыллёвага фонду.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Надвор'е

## І НАВАТ МОКРЫ СНЕГ...

### У панядзелак уначы да -6 градусаў

**Другая дэкада красавіка прынесла беларусам не вельмі прыемны сінаптычны сюрпрыз. І ў гэтыя выхадныя на тэрыторыі Беларусі чакаецца халоднае надвор'е з дажджамі і мокрым снегам, паведамляе намеснік начальніка службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**

А справа ў тым, што да нас завіталі атмасферныя франты ад цыклонаў, якія перамяшчаюцца па поўначы Еўропы. Тэмпературны фон паступова паніжаўся на працягу тыдня, ды і ў выхадныя цяпла не прадбачыцца, паведамляюць спецыялісты. У пятніцу дажджы ў асноўным «прапішуцца» на поўдні краіны, а максімальная тэмпература паветра складзе толькі ад плюс 5 да 11. У выхадныя на тэрыторыі Беларусі пачнуць гаспадарыць франтальныя раздзелы, якія зміяшчаюцца з боку Балтыйскага мора, таму чакаецца няўстойлівае халоднае надвор'е. У суботу ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, уначы з мокрым снегам. Тэмпература паветра ўдзень прагназуецца ад плюс 4 да плюс 11 градусаў, толькі па Брэсцкай вобласці — да 13 цяпла.



**Увага! У нядзелю надвор'е ўвогуле сапсуецца, бо на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу,** якія будуць суправаджацца парывістым ветрам. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 7 градусаў, па поўначы пры праясненнях — да мінус 3. Удзень таксама будзе некамфортна — толькі ад 2 да 9 цяпла. Толькі па паўднёвым усходзе тэмпература павысіцца да плюс 12 градусаў.

У першы дзень наступнага тыдня захаваецца халоднае няўстойлівае надвор'е. Уначы пераважна па паўночна-ўсходняй частцы, а ўдзень — і ў паўночна-ўсходніх і паўднёвых раёнах пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Стане яшчэ халадней. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да плюс 3 градусаў, а пры праясненнях замаразкі будуць дасягаць мінус 6 градусаў. Удзень прагназуецца толькі 2—8 цяпла, а па паўднёвым захадзе — да плюс 10 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*


Годовой отчет эмитента ценных бумаг за 2016 год
ОАО «СОТРУДНИЧЕСТВО»
Адрес: Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с,
Западный промузел, ТЭЦ-4, пом. 183
УНП 390185556

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС** *(в тыс. руб.)*
на 1 января 2017 г.

| АКТИВ | Код строки | На начало периода | На конец периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | 190 | 1 304 | 1 289 |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | 290 | 5 764 | 6 769 |
| **БАЛАНС** | 300 | 7 068 | 8 058 |
| **ПАССИВ** | **Код строки** | **На начало периода** | **На конец периода** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | 490 | 16 | 37 |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | 590 | – | – |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | 690 | 7 052 | 8 021 |
| **БАЛАНС** | 700 | 7 068 | 8 058 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**, *(в тыс. руб.)*
на 1 января 2017 г.

| Наименование показателей | Код строки | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 39 | 90 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (22) | (54) |
| Валовая прибыль | 030 | 17 | 36 |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | 2 | 19 |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | (21) | (18) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | – | 9 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | (21) | (9) |
| Налог на прибыль | 160 | | |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | (21) | (9) |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | – | – |

ИНФОРМАЦИЯ О ДИВИДЕНДАХ И АКЦИЯХ

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тыс. руб. | - | - |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | руб. | - | - |
| Обеспеченность акции имуществом общества | тыс. руб. | 0,16 | 0,36 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | штук | - | - |
| **ИНФОРМАЦИЯ О ЗАДОЛЖЕННОСТИ:** | | | |
| Просроченная дебиторская задолженность | тыс. руб. | - | - |
| Просроченная кредиторская задолженность | тыс. руб. | - | - |

Количество акционеров, всего – 2,количество юридических лиц,входящих в состав акционеров, – 2.
Среднесписочная численность работников – 6 человек.
Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продкуции, работ, услуг: реализация проектов, связанных со строительством зданий (41100).
Общее годовое собрание акционеров проведено 31 марта 2017 года.
По мнению аудиторской организации ООО «Аудит 3Д», бухгалтерская отчетность ОАО «Сотрудничество» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Сотрудничество» на 31.12.2016 г., а также на финансовые результаты деятельности и изменения финансового положения ОАО «Сотрудничество» за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь.

Руководитель С.П. Зелевич
Главный бухгалтер И.В. Палитко



БЕЛАРУСБАНК

**ОФИЦИАЛЬНАЯ ТАБЛИЦА**
**«Восемьдесят седьмого тиража выигрышей по выигрышным вкладам в белорусских рублях», состоявшегося 7 апреля 2017 года в г. Минске**

Выигрыши выпали на следующие номера счетов по выигрышным вкладам во всех учреждениях ОАО «АСБ Беларусбанк»:

| Номера счетов | Размер выигрыша в процентах к средней сумме остатка вклада | Номера счетов | Размер выигрыша в процентах к средней сумме остатка вклада |
|---|---|---|---|
| А009 | 112 (Сто двенадцать) | А556 | 112 (Сто двенадцать) |
| А067 | 112 (Сто двенадцать) | А597 | 112 (Сто двенадцать) |
| А083 | 112 (Сто двенадцать) | А602 | 112 (Сто двенадцать) |
| А125 | 112 (Сто двенадцать) | А643 | 112 (Сто двенадцать) |
| А174 | 112 (Сто двенадцать) | А695 | 112 (Сто двенадцать) |
| А221 | 112 (Сто двенадцать) | А753 | 112 (Сто двенадцать) |
| А256 | 450 (Четыреста пятьдесят) | А770 | 112 (Сто двенадцать) |
| А316 | 112 (Сто двенадцать) | А824 | 112 (Сто двенадцать) |
| А352 | 112 (Сто двенадцать) | А855 | 225 (Двести двадцать пять) |
| А391 | 225 (Двести двадцать пять) | А892 | 112 (Сто двенадцать) |
| А415 | 112 (Сто двенадцать) | А924 | 112 (Сто двенадцать) |
| А460 | 450 (Четыреста пятьдесят) | А978 | 112 (Сто двенадцать) |
| А494 | 900 (Девятьсот) | - | - |

В учреждениях ОАО «АСБ Беларусбанк», где число счетов более одной тысячи, во всех последующих тысячах выиграли те же номера, что и в первой тысяче, т. е. за №№А009, А1009, А2009 и т.д.

**Председатель комиссии:** Кира Александровна Краснокутская — Начальник управления идеологической работы, культуры и по делам молодежи Администрации Первомайского района г. Минска

**Ответственный секретарь:** Наталия Валентиновна Корбут — Заместитель начальника управления клиентского мониторинга департамента розничного бизнеса ОАО «АСБ Беларусбанк»

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Лицензия на осуществление банковской деятельности №1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912



белагропромбанк
традиции будущего

ОАО «Белагропромбанк» сообщает, что в связи с уменьшением с 19.04.2017 ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь на 1 процентный пункт – до 14 процентов годовых с 15.05.2017 ОАО «Белагропромбанк» уменьшает на 1 процентный пункт плавающие процентные ставки по договорам банковского вклада «Универсальный» и «Сберегательный», заключенным в период с 02.08.2004 по 05.03.2006. Также в соответствии с условиями договора пролонгация вклада «Стабильный» осуществляется на условиях применения процентной ставки для данного вида вклада (депозита), действующей на день продления договора.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности №2 13.01.2017 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551


■ Здарэнне

## БОМБА НА БУДОЎЛІ Ў СТАЛІЦЫ

**Небяспечную знаходку часоў Вялікай Айчыннай вайны выявілі ў цэнтры горада.**

— Адбылося гэта ранкам на месцы правядзення будаўнічых работ па вуліцы Я. Купалы. Тут пры зносе будынка комплексу «Белэкспа» экскаватаршчык натрапіў на прадмет, падобны на авіяцыйную бомбу, — расказала **афіцыйны прадстаўнік Цэнтральнага РУУС г. Мінска Таццяна АБОЗНАЯ.** — На месца выяўлення падазронага прадмета была выклікана сапёрна-піратэхнічная група вайсковай часці 5448 унутраных войскаў. Падчас абследавання прадмета было ўстаноўлена, што гэта бомба часоў мінулай вайны вагой 250 кілаграмаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# «ВАКАНСІІ ГРУЗЧЫКАЎ УЖО РАЗАБРАЛІ»

## «На разбітых ЗІЛах працаваць не буду»

— Хто ў чарзе апошні?

Пад дзвярыма, дзе засядае камісія, з раніцы сабралася з дзясятак чалавек. Некаторыя прыйшлі на прыём не першы раз.

— Вы далі мне накіраванне на Жодзінскую ЦЭЦ. А там сказалі, што на вакансію прыбіральшчыцы шмат чалавек прэтэндуе. Пасля сумоўя так і не пазванілі, — ужо ў кабінеце камісіі дзеліцца праблемай маладая жанчына.

Сітуацыя ў Надзеі няпростая. Трое маленькіх дзяцей, муж кінуў, бацькі памерлі. Работы няма: без кваліфікацыі жанчыну нікуды не бяруць. Жыве на адрасную сацыяльную дапамогу і рэдкія аліменты ад былога сужэнца, якога цяпер адправілі ў папраўчую калонію.

**Кіраўнік спраў Барысаўскага райвыканкама Павел ЖУГА**, выслухаўшы, тэлефануе на адно з прадпрыемстваў:

— У вас там вакансіі прыбіральшчыцы ёсць? А яшчэ якія-небудзь рабочыя прафесіі для жанчын? — і, пачуўшы ў трубцы адмоўны адказ, звяртаецца да Надзеі: — На сёння можам прапанаваць толькі вакансію рабочага па добраўпарадкаванні тэрыторыі. Будзеце агароджы фарбаваць, азеляненнем займацца. Заробак, вядома, невялікі, 265 рублёў... А па якіх спецыяльнасцях перанавучанне ў цэнтры занятасці ёсць?

— Цырульнік, кухар. У красавіку якраз групы набіраем, — падказвае **начальнік аддзела садзейнічання працаўладкаванню ўпраўлення па працы, занятасці і сацабароне выканкама Аксана МАЁРАВА.**

Падумаўшы, Надзея згаджаецца пайсці вучыцца на кухара. Усё ж такі са спецыяльнасцю больш шанцаў уладкавацца.

Васіль Арсенцьевіч, мужчына ўжо не малады, таксама прыйшоў на паўторны прыём. Па накіраванні на малочны камбінат яго не прынялі: «пабаяліся, што не на тую кнопку націсну». Па адукацыі Васіль Арсенцьевіч інжынер-механік. Працаваў і ў дарожным будаўніцтве, і ў транспарце, і на мясакамбінаце. Адусюль сыходзіў, бо «прадпрыемствы развальваліся». Апошні запіс у працоўнай кніжцы — за 2011 год: звольнены за прагул. «Мне ў Смаленск трэба было ехаць у заробкі, а кіраўніцтва не адпускала», — апраўдваецца мужчына і дадае, што з таго часу ён так і працаваў па дагаворах у Расіі.



Кіраўнік спраў Барысаўскага райвыканкама Павел ЖУГА пільна вывучае працоўную кніжку кожнага.

Пагартаўшы прапановы ў банку вакансій, камісія вырашае, што найлепшы варыянт — прафесія кіроўцы. Балазе, належная катэгорыя і вопыт у мужчыны ёсць.

— У аўтапарк пойдзеце? — прапануюць беспрацоўнаму вакансію з заробкам у 500 рублёў.

— На разбітых ЗІЛах? Адмаўляюся.

— А ўвогуле кіроўцам працаваць будзеце?

— Не, я ўжо стары для гэтай прафесіі.

Былі і іншыя варыянты, але Васіль Арсенцьевіч застаўся непахісным. У выніку незадаволены і паранейшаму беспрацоўны выскачыў з кабінета.

— У асноўным такая катэгорыя грамадзян на прыём і прыходзіць, — заўважае Павел Іванавіч. — Звольненых за прагулы ці распіццё алкаголю цяпер нават дворнікамі не хочуць браць. І наймальніка можна зразумець: а што, калі чалавек зноў на работу не выйдзе?

Быццам у пацвярджэнне гэтых слоў у дзвярах паказваецца наступны саіскальнік. Аляксандр Іванавіч толькі выйшаў з лячэбна-працоўнага прафілакторыя. Кажа, вылечыўся.

— Прыбіральшчыкам дваровых тэрыторый пойдзеце? — сёння гэта, бадай, самая папулярная прапанова.

— Пайду. А жонцы накіраванне выпішаце? — клапоціцца мужчына пра сужыцельку, якая таксама выйшла з ЛПП.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## Работнікаў чакае калгас

У складзе Барысаўскай камісіі — тры чалавекі. «Бачыў, што ў некаторых раёнах па 15 за сталом збіраецца, але навошта так шмат? — лічыць Павел Іванавіч. — Калі патрэбна нейкая інфармацыя, сазвоньваюся з дзяжурным урачом, РУУС».

Маладая мама Юлія аб камісіі даведалася ад выхавацелькі ў дзіцячым садку. І вырашыла звярнуцца па дапамогу. Разам з сям'ёй яна прыехала ў Барысаў з іншай вобласці: мужа перавялі служыць у Печы.

— У мяне адукацыя эколага-агранома. Але ў калгасе працаваць не змагу. Дзіця з садка забіраць трэба (сваякоў у Барысаве няма), таму шукаю графік з 8 да 17 гадзін, — тлумачыць сваю сітуацыю жанчына з акуратным манікюрам.

Літаральна праз пару хвілін вакансію падабралі — ва ўпраўленні сельскай гаспадаркі і харчавання выканкама якраз аказалася месца для такога спецыяліста.

26-гадовы Дзяніс работу шукае ўжо месяц, але беспаспяхова. Хлопец мае спецыяльнасць электрагазазваршчыка 2-га разраду. Пасля вучылішча працаваў у Расіі на будоўлях. Цяпер жонка Дзяніса чакае дзіця, таму ён хоча ўладкавацца ў Беларусі.

— Я яшчэ слесарам-сантэхнікам магу быць. І грузчыкам гатовы пайсці, — запэўнівае хлопец.

Вакансію зваршчыка для Дзяніса знайшлі ў калгасе. Праўда, не ў самім Барысаве. «Гэта ў вёсцы Кішчына Слабада, — уводзіць у курс справы Павел Іванавіч. — Туды кожны дзень аўтобус ходзіць з вакзала. Нармальная, моцная гаспадарка. Абмяркуеце з дырэктарам і ўмовы, і заробак».

## Слесары? Толькі 6-га разраду

За чатыры тыдні, што працуе камісія, на прыём звярнулася пад 500 чалавек. «Прыходзяць да нас вуліцамі — суседзі адно аднаму раяць», — усміхаецца **вядучы спецыяліст аддзела працоўных адносін упраўлення па працы, занятасці і сацабароне выканкама Таццяна ХАЦКЕВІЧ.**

Чаму такі ажыятаж? У прынцыпе са свабоднымі месцамі ў раёне можна азнаёміцца і самастойна (уся інфармацыя ёсць у Агульнарэспубліканскім банку вакансій), да таго ж дапамогу аказвае служба занятасці.

— Прычына ў тым, што мы выдаём накіраванне, з якім чалавека абавязаны ўзяць на работу. Вядома, калі ён адпавядае кваліфікацыі, — мяркуе Павел Жуга.

Кіраўнік спраў выканкама дадае, што складаней за ўсё ўладкаваць тых, хто сам не ведае, якую працу шукае. «Да нас мужчына на прыём прыходзіў, яму тры гады да пенсіі засталося. У працоўнай кніжцы — 78 запісаў! Больш за тры месяцы ён ні на адным прадпрыемстве не затрымаўся. Расказваў, што яго ніхто не цэніць».

**АФІЦЫЙНА**

**З пачатку года пры садзейнічанні дзяржаўных службаў занятасці ў краіне было працаўладкавана амаль 34 тысячы чалавек. Адметна, што ў сакавіку работу знайшлі 14,7 тысячы чалавек — гэта максімальны сакавіцкі паказчык з 2013 года.**

Усяго ў Барысаўскім раёне адкрыта каля 460 вакансій. Заробак у асноўным да 400 рублёў. Самыя запатрабаваныя спецыялісты — урачы (каля 100 месцаў) і медсёстры (60). Складана закрываюцца вакансіі ў сельскай гаспадарцы: не хапае галоўных заатэхнікаў, ветурачоў, аграномаў. У прамысловасці ёсць прапановы для токараў, шліфоўшчыкаў, слесараў. Але пажадана мець 6-ы разрад.

А вось некваліфікаваныя рабочыя амаль не патрэбны. Вакансіі грузчыкаў закончыліся яшчэ тры тыдні таму. Дворнікі цалкам укамплектаваны, санітарак і прыбіральшчыкаў таксама дастаткова.

Раённыя камісіі па працаўладкаванні будуць дзейнічаць да канца красавіка.

— Прэзідэнт сказаў: ва ўсіх павінна быць работа. Мы выконваем задачу, — падсумоўвае Павел Іванавіч. — Калі чалавек хоча працаваць — прапаноўваем варыянты.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

*Мінск — Барысаў — Мінск.*



Фота Надзеі БУЖАН.

Тым, у каго няма кваліфікацыі, прапануюць ісці рабочымі па добраўпарадкаванні тэрыторыі.


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**по продаже земельных участков в частную собственность граждан для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

Неманский сельский исполнительный комитет **16 мая 2017 года** по адресу: аг. Могильно, ул. Комсомольская, 57, зал заседаний, в 15.00 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов.

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (бел. руб.) | Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения) (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот №1 | Неманский сельисполком | д. Броды-1, ул. Центральная,1В | 0,1489 | 625682900601000037 | 1550,00 | 54,00 |
| Лот №2 | Неманский сельисполком | д. Броды-1, ул. Центральная, 2А | 0,1197 | 625682100301000040 | 1300,00 | — |
| Лот №3 | Неманский сельисполком | д. Ракошичи, ул. Луговая, 2А | 0,1500 | 625682108701000160 | 1550,00 | 1211,42 |
| Лот №4 | Неманский сельисполком | д. Кухтичи, ул. Карачуна, 136А | 0,1500 | 625682103901000309 | 2600,00 | 1456,73 |
| Лот №5 | Неманский сельисполком | д. Замостье, ул. Заречная, 40А | 0,1200 | 625682102101000077 | 900,00 | 1554,52 |

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Имеется возможность подключения к электроснабжению. К земельному участку в д. Кухтичи, ул. Карачуна, 136А имеется возможность подключения газоснабжения.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет №3641062500039 Неманского сельского исполнительного комитета в ЦБУ №625 филиала №500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО 153001601, УНП 600110100, код платежа - 04901.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: аг. Могильно, ул. Комсомольская, 57, кабинет управляющего делами, с 8.00 до 17.00 по рабочим дням **по 10 мая 2017 года** включительно.

**Участники аукциона должны представить следующие документы:**

• заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

• заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка;

• копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

• представителем гражданина – нотариально заверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан представляют документ, удостоверяющий личность.

Заключительная регистрация – с 9.30 до 14.45 в день проведения аукциона.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем предмета аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробную информацию об аукционах, условиях участия можно узнать по телефонам: (801718) 43337, 43317



## Извещение о проведении 27 апреля 2017 года

**повторных торгов с условиями по продаже недвижимого имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Минскремстрой»**

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества)** | «Помещение общественного питания №1» общей площадью 872,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Харьковская, д. 3А, пом.1 (инв. номер в ЕГРНИ: 500/D-687650; назначение: помещение общественного питания) |
| **Сведения о продавце** | ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220030, г. Минск, телефон (017) 226-41-15 |
| **Сведения об организаторе торгов** | Государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск, телефон (017) 327-05-62 |
| **Начальная цена предмета торгов с учетом НДС, бел. руб.** | 311 350,91 |
| **Размер задатка, бел. руб.** | 30 000,00 |
| **Условие торгов** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов |

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию документа, подтверждающего внесение задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лиц, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» №3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в торгах.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 27 апреля 2017 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 14.04.2017 по 26.04.2017 включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 200-99-78, (029) 350-46-23 (ОАО «Минскремстрой»)

■ За кадрам

# АБЕД З ДЫПЛАМАТАМ,

## або Як пакаштаваць экзатычныя стравы, не выходзячы з дому

**У гэту нядзелю на «Беларусь 1» вяртаецца абноўленая праграма «Кулінарная дыпламатыя», у якой беларусы не толькі знаёмяцца з нацыянальнымі кухнямі і традыцыямі розных краін, але і могуць зірнуць па-новаму на саміх сябе — вачыма пасло́ў гэтых краін, якія пэўны час жывуць і працуюць у нашай рэспубліцы. Першыя два сезоны праекта, сцвярджаюць у Белтэлерадыёкампаніі, мелі вялікі поспех сярод гледачоў і ўдзельнікаў, таму гастранамічнае падарожжа вырашана было працягнуць.**



**«У кожнай праграме раблю для сябе адкрыцці, і не толькі кулінарныя», — прызнаецца тэлевядучая Юлія ПЯРЦОВА.**

Што змянілася ў «Кулінарнай дыпламатыі» ў новым сезоне? Перш за ўсё, вядучая — на змену Ларысе Гулякевіч прыйшла журналіст Агенцтва тэленавін Юлія Пярцова. Акрамя таго, цяпер праграма мае выразны сямейны ўхіл: на тэлевізійную кухню-студыю паслы замежных дзяржаў з задавальненнем прыходзяць з жонкамі і дзецьмі, а творчая група праекта дапаўняе кулінарную частку сюжэтамі пра ўдзельнікаў або гісторыка-культурныя каштоўнасці краін, якія яны прадстаўляюць. У студыі з'явілася дэгустацыйная зона, якая яшчэ больш збліжае ўсіх удзельнікаў за адным сталом. Дзеля ажыўлення праграмы абяцаюць забаўляльныя элементы — фокусы, танцы, песні... Ну і, вядома, практычна кожны госць дзеліцца ўласнымі ўражаннямі пра Беларусь — і, як заўважае вядучая, акрамя звыклых кампліментаў чысціні, даволі пачуць шэраг нечаканых гісторый. Прыкладам, пасол Славакіі ў Беларусі расказаў, як дыпламатыя дапамагае яму ў стасунках з гандлярамі на Камароўскім рынку, дыпламаты з Паўднёвай Карэі ці не кожны тыдзень бываюць у Вялікім тэатры оперы і балета і захапляюцца ўзроўнем нашых артыстаў, а кіраўніка дыпмісіі Эквадора прыемна ўразіла сумленнасць нашых суайчыннікаў і бяспека на вуліцах.

Пасол Літвы Андрус Пулокас — менавіта ён разам з жонкай адкрывае новы дыпламатычна-кулінарны сезон на «Беларусь 1» — здзівіў здымачную групу добрым веданнем салігорскіх шахтаў, якія лічыць турыстычнай «фішкай» нашай краіны, дружалюбнай «свойскасцю», далікатнасцю і ўпэўненасцю на кухні, што ўласціва далёка не кожнаму мужчыну. Наогул, нягледзячы на высокія статусы і рангі, ніхто з удзельнікаў не адмовіўся пакухарыць пад прыцэлам тэлекамер і расказаць не толькі пра нацыянальныя стравы, але і пра ўласны лад жыцця. Калі ж ёсць нейкія закрытыя для размовы тэмы, пра іх папярэджваюць загадзя.

— Якая з ужо адзнятых праграм найбольш запомнілася? — перапытвае Юлія Пярцова, пакуль накладваюць грым, рэквізітары і памочнікі на кухні раскладваюць неабходныя інгрэдыенты, а мы чакаем сённяшняга госця. — Ведаце... усе! Літва, Палесціна, Таджыкістан, Фінляндыя, Эквадор, Карэя, Славакія, Эстонія — кожны выпуск, як маленькае падарожжа ў пэўную краіну, можна нават на карце свету адзначаць, дзе мы «пабывалі». І кожны чымсьці ўражвае па-свойму. Для мяне, напрыклад, было адкрыццём, што заяўлены эквадорскі рэцэпт здаваўся вельмі экзатычным — крэветкі, мноства спецый — а ў выніку аказалася, што прыгатаваць гэту страву можна на звычайнай кухні, і нават часу спатрэбіцца няшмат. Кухня Палесціны здзівіла наяўнасцю ў ёй... звычайных пельменяў! Праўда, з некаторымі нюансамі — фарш палесцінцы папярэдне абсмажваюць, а самі пельмешкі вараць у кефіры, прычым ёсць свае хітрыкі, каб ён не звярнуўся, — атрымліваецца незвыкла, але насамрэч вельмі смачна.

***— Ці ўзялі вы нейкі «дыпламатычны» рэцэпт для сваёй сямейнай кухні?***

— Усе ўзяла, бо насамрэч іх усе рэальна прыгатаваць дома. Нават таджыкскі плоў пры веданні некаторых нацыянальных «сакрэтных ключыкаў», якімі з намі падзяліўся спадар пасол, на вашай кухні атрымаецца самы сапраўдны — так што глядзіце праграму, не пашкадуеце! А я ў найбліжэйшы час, калі прыйдуць у госці сябры, парадую іх якой-небудзь экзатычнай стравай з дыпламатычнай кухні.

А яшчэ «Кулінарная дыпламатыя» развее некаторыя міфы. Так, многія беларусы ўпэўнены, што да нас завозяць толькі кармавыя бананы. Ці ядуць такія ў Эквадоры і ці ўсе бананы падыходзяць для смажання, або наколькі распаўсюджаная на беларускіх кірмашах «карэйская морква» насамрэч мае дачыненне да Карэі — пра гэта вядучая і гледачы даведаюцца, што называецца, з першых вуснаў.

***— Наколькі складана было прыйсці ва ўжо існуючую праграму і прыўнесці ў яе штосьці сваё? Гледачы ж прывыклі да манеры Ларысы Гулякевіч...***

— У мяне ёсць такая асаблівасць — схільнасць парадзіраваць убачанае, таму спецыяльна не праглядаю ранейшыя выпускі «Кулінарнай дыпламатыі», каб міжволі нешта не скапіраваць. А з Ларысай мы сябруем, і яна папярэджвала, што «раскрыць» дыпламатаў бывае даволі няпроста. Але з іншага боку, гэта вельмі ўзбагачае: ты атрымліваеш новыя ўражанні, даведваешся пра некаторыя нераскручаныя, але надзвычай цікавыя турыстычныя мясціны, бачыш сябе вачыма іншаземцаў, а калі ўдаецца знайсці кантакт, то нават моўны бар'ер знікае. Часам мы настолькі разнявольваемся, што нібыта сапраўды знаходзімся на кухні як старыя добрыя сябры, і толькі потым спахапляешся: гэта ж дыпламат! Да нас жонка пасла Паўднёвай Карэі прыйшла з перакладчыкам: па-за кадрам мы размаўлялі на англійскай (*Юлія — лінгвіст, перакладчык па адукацыі. —* **Аўт.**), а падчас здымак — маё пытанне, пераклад, яе адказ, пераклад... І так мы разгаварыліся, што я задаю наступнае пытанне пра Беларусь і яе ўражанні, а яна, не чакаючы перакладу, пачынае адказваць. Ва ўсіх лёгкі ступар, а госця ўсміхаецца: "Я ўсё зразумела».

...У студыю прыбылі ўдзельнікі сённяшняй праграмы — кіраўнік славацкай дыпмісіі з сям'ёй і... кошыкам прадуктаў, сабраных «на ўсякі выпадак». Насамрэч патрэбныя для выбраных страў інгрэдыенты тэлевізійнікі рыхтуюць напярэдадні, але часам рэцэпт змяшчае вельмі ўжо рэдкія і незвычайныя складальнікі — тады госці прыносяць іх з сабой, а гледачам расказваюць, чым можна гэта замяніць. «Вельмі ўразіў наш госць з Фінляндыі прадуктамі, якія фіны традыцыйна выкарыстоўваюць у кулінарыі. Ён прынёс з сабой ягады ядлоўцу, з якіх робіцца смачны соус, і адзін неймаверны прадукт з хвоі — высыпаючы яго з пакецика, я чакала ўбачыць шышкі ці нешта такое, а ўбачыла... пух. Як высветлілася, гэта высушаныя і здробненыя маладыя пабегі елак, якія выкарыстоўваюцца ў кулінарыі. А яшчэ мы гатавалі з фінскім госцем слабасалёнага ласося пад лакрычным марынадам, для чаго выкарыстоўваліся лакрычныя цукеркі са спецыяльным водарам дзёгцю — у іх не адчуваецца гэты спецыфічны лакрычны смак, што многім не даспадобы. Мы таксама сумняваліся, што атрымаецца, а потым за кадрам усё каштавалі і каштавалі той соус, пасля праграмы літаральна за хвіліну ўсё з'елі», — смяецца Юлія Пярцова.

Пабываўшы на тэлекухні, пацвярджаем: тут няма муляжоў, усё, ад молатых спецый да малака ў слоіку, сапраўднае і свежае. «М-м-м, — прынюхваецца вядучая то да сушаных белых грыбоў, то да вэнджанага сала, — які водар, ашалець можна!» — «Цярпі, Юля, да канца здымак», — глытаюць слінку рэдактары, і вядучая, хуценька зрабіўшы маўленчую размінку, запрашае дыпламатаў кашаварыць. Зрэшты, нягледзячы на буйства ядомых фарбаў і водараў, за некалькі гадзін, што запісваецца 25-хвілінны выпуск, героі часам настолькі захапляюцца гаворкай, што забываюцца пра ўсё астатняе, і толькі сярдзітае пыхканне каструлек вяртае ў рэальнасць. Шкада, што ў хранаметраж праграмы трапяць далёка не ўсе філасофска-сур'ёзныя, забаўныя і кранальныя моманты, якія адбываюцца на здымках — але, мабыць, галоўнае, каб гатовая «страва» прыйшлася даспадобы гледачам.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
*tselyashuk@zviazda.by*



**Здымаць смажанае сала буйным планам — тое яшчэ выпрабаванне для апетыту!**



**Спецыі і вэнджанае сала, а таксама «сакрэтны інгрэдыент» — капусны расол — ва ўмелых руках дыпламатычнай сям'і зусім хутка стануць асновай фірменнай верашчакі.**

### Пакаштуйце!

*Рэцэпты ад пасла Літвы ў Беларусі Андруса Пулокаса*

#### Літоўскі халаднік

***Спатрэбіцца:*** *2 буракі, 2 калючыя агуркі, 1 літр кефіру, 3 курыныя яйкі, 5—6 бульбін, па 1 пучку цыбулі і кропу, 3 ст. лыжкі смятаны, соль на смак.* Буракі адварыць і нацерці на буйной тарцы. Агуркі, кроп і зялёную цыбулю здрабніць, усё скласці ў каструлю, перамяшаць, заліць кефірам і пасаліць. Перад падачай у талеркі кладуць паразанае на чацвярцінкі яйка, смятану і зяленіва, а асабліва смачны літоўскі халодны боршч з варанай гарачай бульбай.

#### Торт «Гультай»

***Спатрэбіцца:*** *4-5 пачкаў любога пясочнага пячэння, 250 грамаў сметанковага масла (пажадана тлустасцю 82%), плітка шакаладу, 1 бляшанка згушчонкі, 3—6 ст. лыжак какавы, 2 пачкі арэхаў (фундук або міндаль), 2 ч. лыжкі распушчальнай кавы, 50—100 грамаў кававага лікёру.* Пячэнне дробна паламаць, растопленае масла змяшаць са згушчонкай і какавай, дабавіць падсмажаныя арэхі, каву, лікёр, здробнены шакалад. У атрыманую масу высыпаць пячэнне, зноў добра перамяшаць, завярнуць у фольгу і прыдаць пэўную форму. На ноч торт пакінуць у халадзільніку, а перад падачай парэзаць.

## Серада, 19 красавіка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.45** Зона Х.
**9.10, 22.05 Серыял «След».***
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар.
**11.35, 12.10, 20.00 Серыял «Практыка». Заключная серыя.***
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».***
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Сямейны ачаг».***
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.05** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** «Справа жыцця». Дак. фільм.
**0.40** Дзень спорту.
**0.50 Серыял «Снайперы. Каханне пад прыцэлам».***

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.25** Тэлебарометр.
**9.05, 18.00 Серыял «Каханне і іншыя недарэчнасці...»***
**11.00, 17.00 Серыял «Анжаліка».***
**12.05, 19.55** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**13.45** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**14.55** Два рублі.
**15.20, 0.15** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05 Трылер «Тут нехта ёсць...»***
**21.30** Спортлато 5 з 36, КЕНО.

**21.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. «Манака» (Францыя) — «Барусія» (Дортмунд, Германія).
**23.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. Агляд.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.40** «Беларуская кухня». Крупнік і гамолкі.
**8.05, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15, 14.30, 20.20, 23.30** «Гэты дзень».
**8.25, 18.15 «Доўгая дарога ў дзюнах». Драма.***
**9.40, 13.00 «Танга нашага дзяцінства». Драма.***
**11.10, 15.00 «Чыста англійскія забойствы». Дэтэктыў. «Забойства ў Баджэрс Дрыфт». 2-я серыя.***
**12.20, 19.35** «Легенды беларускай эстрады». «Дзяўчына з гітарай». Надзея Мікуліч.
**12.50** «Час кіно».
**14.35** «Святло далёкай зоркі». Памяці народнага мастака БССР Валянціна Волкава.
**15.55, 21.05** «Паляўнічыя на скарбы».*
**16.30, 21.45 «Снайпер. Зброя помсты». Баявік. 3-я і 4-я серыі.***
**20.25** «Мастацтва Беларусі — 1970» (сакавік).
**20.40** «Калыханка».
**23.35** «Гітара па крузе».

### Беларусь 5

**8.00** Футбол. Кубак Беларусі. 1/2 фіналу. Першы матч. ФК «Слуцк» — «Шахцёр» (Салігорск).
**9.50** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. Матч у адказ. «Рэал» (Мадрыд, Іспанія) — «Баварыя» (Германія).
**11.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. Матч у адказ. «Лестэр» (Англія) — «Атлетыка» (Іспанія).
**13.50** Хакей. КХЛ. Фінал. 6-ы матч. СКА (Санкт-Пецярбург) — «Металург» (Магнітагорск).
**15.45** Спорт-кадр.
**16.15** Змешаныя адзінаборствы. Адкрыты кубак Беларусі.
**18.15** Фактар сілы.
**18.45** Козел пра футбол.
**19.05** Футбол. Кубак Беларусі. 1/2 фіналу. Першы матч. «Дынама» (Брэст) — БАТЭ (Барысаў).
**21.00** Слэм-данк.
**21.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. Матч у адказ. «Барселона» (Іспанія) — «Ювентус» (Італія). (У перапынку — PRO спорт. Навіны.)

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Навіны (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.15** «Смак».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Кантрольная закупка».
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Што і трэба было даказаць».***
**23.00** «Вячэрні Ургант».
**23.35 Серыял «Салам Масква».****
**0.35** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.05** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40, 23.55 «Важняк. Гульня навылет». Серыял.**
**12.30, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Тэрыторыя памылак».
**15.30** «У нас усе дома».
**16.50** «Аўтапанарама».
**17.10** «Вадзіць па-руску».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**22.00** «Глядзець усім!»
**1.35 Маст. фільм «Камедыянт».***

### МІР

**10.00** «Яшчэ танней».*
**10.30 Маст. фільм «Кіроўца для Веры».***
**12.30** «Любімыя акцёры», Вячаслаў Нявінны.*
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Няма праблем!»***
**14.55** Дак. фільм «Сямейныя драмы».***
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».***
**19.20, 4.05 Серыял «Закон і парадак».***
**22.10 Маст. фільм «Блажэнная».***
**0.00 Серыял «Спрут».***
**1.50 Серыял «Гарачы лёд».***

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**7.30 Маст. фільм «Інсайт».***
**9.10 Маст. фільм «На раздарожжы».***
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.20** «Пакой смеху».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Скліфасоўскі».**
**19.15, 20.40 Серыял «Асабовая справа».**
**22.00, 23.10 Серыял «Ганна Карэніна».**
**23.55** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**6.25** «Астрапрагноз».
**6.30** «Кватэрнае пытанне».0
**7.25 Серыял «Час Волкава».***
**9.00 Серыял «Мухтар. Новы след».***
**9.50, 23.10** «НЗ.by».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.30 Серыял «Ляснік».***
**12.10** Суд прысяжных.***
**13.25, 16.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05** «Месца сустрэчы».
**17.05, 19.45 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».***
**21.25 Серыял «Траса смерці».***
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00 Серыял «Шэф».***

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**10.15** «Сябры Дзядулі Марка».
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00 Камедыя «Прывід».**
**12.55, 19.20 Серыял «Каралеўства».**
**14.20 Серыял «Прыгоды маладога Індзіяны Джонс».**
**15.55, 19.15, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** «Мультпарад». «Браты Грым».
**16.40 Серыял «Каўчэг».**
**18.00 Серыял «Агент Картэр».**
**18.45** «Мой любімы гадаванец».
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Камедыя «Марлі і я».**
**23.05 Серыял «Ведзьмы Усходняга Ўзбярэжжа».**

---

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**6.30, 3.25** М/ф «Ёка».
**6.50, 3.45** М/ф «Фіксікі».
**7.10, 4.05** М/ф «Маша і Мядзведзь».
**7.30, 4.25** «Ералаш».
**8.30** Серыял «Сямейны бізнес».
**9.30** Камедыя «Кактус».
**11.20** Скетч-шоу «6 кадраў».
**12.00, 5.10** Серыял «Я лячу».
**13.00** «Лаві момант».
**13.30, 17.50, 23.40** «Уральскія пельмені».
**14.00, 20.10** Серыял «Кухня-5».
**15.10, 19.00** Серыял «Маладзёжка-4».
**16.20** Серыял «Татавы дочкі».
**16.50** Серыял «Закрытая школа-2».
**21.20** Баявік «Кніга Ілая».
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка».
**1.50** Серыял «Месяц».
**2.40** «Не можа быць!»

### Культура

**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 23.50** «Пустая карона: вайна Пунсовай і Белай ружы. Генрых VI». Серыял.***
**13.00** «Валагодскія матывы». Дак. фільм.
**13.10** «Пешшу...» Масква яўзская.
**13.40** «Жанчыны, якім пашанцавала». Маст. фільм.
**15.10, 23.00** «Заслужаны гультай Расійскай Федэрацыі. Валерый Сіроўскі». Дак. серыял.
**15.40** «Пампеі. Жыццё, якое застыла ў часе». Дак. фільм. Частка 2-я.
**16.25** «Уільям Гершэль». Дак. фільм.
**16.35** «Больш чым каханне». Уладзімір і Вера Набокавы.
**17.20** Сустрэча на вяршыні. «Гульні розуму з Таццянай Чарнігаўскай».
**17.50** Да юбілею Міхаіла Плятнёва. Творы для фартэпіяна Л. Бетховена і Ф. Ліста.
**18.35** «Аркестр будучыні».
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Абсалютны слых».
**20.45** «Правілы жыцця».
**21.15** Улада факта. «Матрыярхат і фемінізм».
**22.00** Прыступкі цывілізацыі. «Незвычайнае падарожжа абеліска». Дак. фільм.
**23.45** Мастсавет.
**1.30** «Тры тайны адваката Пляваки». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Майк Навуменка». 2005 год.****
**6.55, 8.35, 9.40, 11.00, 12.55, 14.35, 15.40, 17.00, 18.55, 20.45, 21.40, 5.45** Музычная настальгія.
**7.30, 13.30, 19.30** Маст. фільм «12 крэслаў».***
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час».*
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».*
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Праўда пра «Праўду».***
**18.00** «Спяем, сябры!» з Наталляй Казялковай. 2005 год.***
**0.00** «Акулы пяра». Гурт «Ногу свело». 1997 год.***
**0.50** Дак. фільм «Выбары-96. Страсці па ўладзе».****
**1.50** «Час пік» з У. Лісцьевым.***
**2.20** «Мы Вас любім!» Канцэрт гурта «Воскресение». 1994 год.***
**3.30** Фільм-спектакль «Антоній і Клеапатра».***

### EuroSport 1

**4.00** Веласпорт. Гонка «AMSTEL GOLD».
**5.30** Веласпорт. «Тур Харвачыі».
**6.30, 11.05** Веласпорт. «Альпійскі тур».
**7.30, 12.00, 15.00, 17.45, 21.00, 0.00, 2.30** Снукер. Чэмпіянат свету.
**9.30** Аўтаспорт. Этап чэмпіянату свету па гонках на вынослівасць.
**10.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**10.30** Футбол. «ФІФА».
**11.00** Зімовыя віды спорту. «У пагоні за гісторыяй».
**15.30, 1.05** Веласпорт. Флэш Валонь.

### Кінакамедыя

**0.30** Камедыя «Адной левай».*
***2.00 — Прафілактыка на тэлеканале.***
**10.10** Меладрама «Персанаж».*
**12.05** Меладрама «Па той бок».***
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».***
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».***
**16.15** Камедыя «Змешаныя пачуцці».***
**17.50** Камедыя «Падарунак з характарам».*
**19.30** Камедыя «Памятаю — не памятаю».*
**20.50** Камедыя «Няголены нянь».***
**22.25** Камедыя «Пятніца».***

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.05** «Ёсць адзін сакрэт».
**8.30** «Доктар І...»
**9.00, 19.05, 3.05** «Вузел лёсу». Серыял.
**10.35, 4.30** «Судовыя страсці». Серыял.
**12.15** «Сляпая».
**13.15** «Варажбітка».
**14.20** «Паралельны свет».
**15.15** «Вайна нявест».
**15.45** «Здзелка».
**16.15** «Натуральны адбор».
**17.10** «Шчыра».
**18.05** «Неспакойны ўчастак». Серыял.
**20.45** «Магазіна».
**21.45** «Рэвізора».
**23.05** «Лінія абароны».
**23.35** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.20** «На грэбні хвалі». Трылер.***
**2.20** «Амерыканскі жаніх».

### ТБ1000

**6.10, 15.20** Сем'янін.*
**8.35** Хлусня дзеля выратавання.***
**11.05** Назад у будучыню ІІ.*
**13.15** Экстрасэнс.***
**18.05** Жорсткія гульні.***
**20.10** Найноўшы запавет.****
**22.25** Працяжка.***
**0.20** Пераправа.***
**2.40** 11:14.***
**4.05** Місія «Серэніці».***

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Іван.
**8.15** СуперБабровы.*
**10.25** Аднакласніцы.***
**12.15** Брыльянты для дыктатуры пралетарыяту. 2-я серыя.***
**13.55** Дублёр.***
**15.50** 2 дні.***
**17.45** Каралёў.*
**20.20** #пойдземукіноАксана. Адваротны адлік.***
**22.30** Пецяа па дарозе ў Царства Нябеснае.***
**0.40** Вязень старой сядзібы.*
**2.50** Падарунак з характарам.0
**4.30** Адарванне.***

### National Geographic

**6.00, 9.25, 13.15, 20.15** Гульні розуму.*
**6.45, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.*
**7.55, 10.55, 14.45** Мегазаводы.*
**8.40, 15.35** Шаша праз пекла.*
**10.10** Уварванне на Зямлю.*
**11.40, 16.15, 19.25, 2.30** Расследаванні авіякатастроф.*
**12.30, 18.40, 21.45, 1.45, 4.50** Навука будучыні.*
**17.55, 21.00, 1.00, 4.05** Пачатак.*
**22.30** Асабліва строгі рэжым.***
**23.20** Непакорныя акіяны.****

### Discovery

**8.00, 14.00, 18.00** Залатая ліхаманка.***
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?*
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?*
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Склады.*
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Бітвы за кантэйнеры.*
**11.00, 13.30** Прапажы на продаж.***
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.*
**19.00** Ратавальнікі-цяжкавагавікі.***
**20.00** Тэхнагеніка.*
**0.00, 3.50** Выжыць любой цаной.*
**1.00, 6.20** Мегаперавозкі.*
**2.00, 4.40** Маланкавыя катастрофы.***

---

## Усходні гараскоп на

**АВЕН.** Прыйшоў час выпраўляць назапашаныя за мінулыя дні памылкі, ды і наогул — напярэдзе не самы спакойны тыдзень. Паспрабуйце не прымаць паспешлівых рашэнняў, бо любы промах можа надоўга пазбавіць у вашай душы пачуццё віны. Серада — удалы час для планавання далейшых дзеянняў, для вызначэння стратэгіі і тактыкі. Вучыцеся слухаць і чуць, паспрабуйце выконваць просьбы навакольных, калі яны рэалістычныя, і тады неабходная дапамога своечасова прыйдзе і да вас.

**ЦЯЛЕЦ.** На гэтым тыдні фартуна ўсміхаецца вам. Увасабляйце ў жыццё даўнія праекты, яны могуць прынесці поспех. У аўторак пакадана не ўзвальваць на свае плечы занадта шмат працы, ёсць рызыка не справіцца. Паспрабуйце сачыць за тым, што кажаце, вашы словы могуць быць выкарыстаныя супраць вас у найбліжэйшай будучыні. Не хавайце радасці ці засмучэння ад блізкіх, і яны з разуменнем паставяцца да вашых праблем. Іх падтрымка падбадзёрыць і надасць сіл.

**БЛІЗНЯТЫ.** Давядзецца выйсці за рамкі звыклага асяроддзя, каб лепш разабрацца ў сітуацыі, якая склалася. Толькі так можна ўбачыць прывабныя далёкія перспектывы. Больш увагі ўдзяляйце марам, тады яны пачнуць ажыццяўляцца. У сярэдзіне тыдня вам могуць прапанаваць выгадны праект, згаджайцеся, але не даводзьце сябе даператамлення. Спрыяльна складваецца сітуацыя ў адносінах з блізкімі людзьмі і сябрамі. У выхадныя варта трохі расслабіцца і выбраць пасіўны адпачынак.

**РАК.** На гэтым тыдні давядзецца папацець — чым бы вы ні займаліся, гэтая дзейнасць запатрабуе велізарнага напружання і самааддачы. У гэты час вашы аналітычныя здольнасці будуць на вышыні. Перад вамі адкрываюцца новыя перспектывы, з'яўляюцца магчымасці рухацца далей і рэалізаваць сябе. У аўторак і сераду старайцеся займацца кар'ерай але ў шкоду асабістаму жыццю, праблемы на працы часовыя, а адносіны з блізкімі будуць уразлівай сферай. У выхадныя не варта адмаўляцца ад паходу ў госці.

**ЛЕЎ.** Добры час для завяршэння ўсіх пачатых спраў і паступовага падвядзення вынікаў. Будзьце ўпэўненыя ў сваіх сілах і магчымасцях. Паспрабуйце прадумваць усё да дробязяў, яны цяпер асабліва важныя. Лепш пайсці на кампраміс з начальствам, чым спрачацца і псаваць адносіны. Ваша сям'я падтрымае і ўхваліць вашы дзеянні. Магчымы грашовыя паступленні за кошт таго, што падвядзены вынікі праведзенай працы і надышоў час з вамі разлічыцца. Гэты тыдзень падыходзіць больш для адпачынку ці для таго, каб уносіць апошнія штрыхі.

**ДЗЕВА.** Паспрабуйце ўцiхамірыць сваю ганарыстасць і не адмаўляйцеся ад прапанаванай дапамогі, бо шанцы справіцца з пастаўленымі задачамі ў адзіночку роўныя нулю. У панядзелак галоўныя навіны могуць чакаць вас дома. У аўторак пастарайцеся вызваліць для сябе больш часу і звесці зносіны з калегамі, сябрамі і асабліва — з раднёй да разумнага мінімуму. У сярэдзіне тыдня не выключаны канфлікты з дзелавымі партнёрамі. Пастаўцеся сур'ёзна да праблем блізкіх людзей.

# ШАШКІ

**Выпуск №35**

1 красавіка ў Якуцку адбыўся суперматч па рускіх шашках з прызавым фондам 100 000 расійскіх рублёў паміж сямікратным чэмпіёнам свету Гаўрылам Колесавым і чатырохкратным чэмпіёнам свету Мікалаем Стручковым. Якуцкія гросмайстры згулялі паміж сабой тры мікраматчы з шасці бліцпартый. Першыя чатыры паядынкі скончыліся ўнічыю. У пятай партыі Гаўрыл Колесаў здолеў перамагчы ў драматычнай барацьбе і атрымаў прыз.

Для самастойнага рашэння прапануюцца кампазіцыі, складзеныя вядучым аддзела.

**№63**

**Белыя простыя шашкі:** c5, d4, f2, g1, h2, белыя дамкі b4 (6).

**Чорныя простыя шашкі:** a7, b2, e3, e7, g5, g7,h4, чорныя дамкі a5 (8).

**№64**

**Белыя простыя шашкі:** a7, c7, d2, e1, e3, g3 (6).

**Чорныя простыя шашкі:** b2, b4, e5, g5, g7, h2 (6).

У абедзвюх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

**№63**




**Праверце свае рашэнні:** Выпуск №34 ад 31.03.17.

**№60** 1. cd4? ec3 2. bd2 hg5 3. Fh6 fg7 4. Hf8 dc5 5.fb4 ae1+

**№61** !c3.e7.g5x !g7?=

**№62** 1.a7-b8 e3:g5 [ 1...h4:f2 2.f4-g5 h6:f4 3.c7-d8 e5:c7 4.d8:e5 e3-d2 5.e5-c3 ]

2.d6:f4 g5:e3 3.c7-d8 h4:f2 4.b8-f4 e3:g5 5.d8:a5 2-0

Правільныя адказы даслалі П. Аніканаў (Шчучын), А. Шурпін (Клімавічы), І. Ананіч (Гродна), В. Таўкачоў (Клімавіцкі р-н), В. Ваўчкоў (Маладзечна), У. Бандарык (Мінскі р-н), А. Ліцьвінаў, П. і В. Шульгі (Мінск).

*Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, газета «Звязда»*

*e-mail: info@zviazda.by, або vorush@yandex.ru*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту**

## ■ Тэлесеткі

# Бізнес па плане

**Амаль 4 сотні заявак падалі беларускія прадпрымальнікі на ўдзел у трэцім сезоне праекта «Мой бізнес» на тэлеканале АНТ. Самаму юнаму прэтэндэнту — усяго 14 гадоў, а самыя сталыя фантаніруюць ідэямі, нягледзячы на пенсійны ўзрост.**

Гэтым разам, расказалі арганізатары, месцы ў крэслах настаўнікаў зоймуць кіраўнік інвестыцыйнай кампаніі, спецыяліст па антыкрызісным кіраванні, а таксама прадстаўнікі банкаўскай і прамысловай сферы. Нагадаем, паводле новых правілаў, кожны ментар возьме пад крыло ўдвая больш праектаў — па 4, а гледачы стануць актыўнымі ўдзельнікамі працэсу на ўсіх этапах шоу і вызначаць пераможцу, які атрымае прыз у 20 000 беларускіх рублёў.

**Вікторыя ЗАХАРАВА** ■

## Пятніца, 21 красавіка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 1.05** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.20** Зона Х.
**9.10 Серыял «След».*****
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар.
**11.35, 12.10, 20.00 Серыял «Шэсць сотак шчасця».*****
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00, 17.40 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».*****
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 16.30 Серыял «Сямейны ачаг».*****
**21.00** Панарама.
**21.45 Меладрама «Я ведаю твае сакрэты». 1—4-я серыі.***
**1.20** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 0.00** Тэлебарометр.
**9.05, 18.00 Серыял «Каханне і іншыя недарэчнасці...»*****
**11.05, 17.00 Серыял «Анжаліка».*****
**12.10, 19.55** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**14.10** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05 Трылер «Тут нехта ёсць...»*****
**21.45, 22.10** «Бітва экстрасэнсаў. 15-ы сезон».
**22.05** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**0.05 Баявік «Паркер».*****

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.40** «Беларуская кухня». Пірог «Трухлявы пень».
**8.05, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15, 14.40, 20.20, 23.45** «Гэты дзень».
**8.25, 18.15 «Доўгая дарога ў дзюнах». Драма.***
**9.40, 13.10 «Мачаха Саманішвілі». Драма.***
**11.10, 15.00 «Чыста англійскія забойствы». Дэтэктыў. «Вендэта па-англійску». 2-я серыя.*****
**12.20, 19.30** «Легенды беларускай эстрады». «Раманс пра закаханага». Якаў Навуменка.
**12.45** «Сіла веры».
**14.35** «Выйсце ёсць». Аляксей Хлястоў.
**15.50, 21.05** «Паляўнічыя на скарбы».*
**16.30 «Шмат шуму з нічога». Камедыя.***
**20.20** «Мастацтва Беларусі — 1971» (люты).
**20.30** «На прыродзе з Віталем Гуменным».
**20.40** «Калыханка».
**21.40** «Час кіно».
**21.50 «Апошняя вайна». Драма.*****



### Беларусь 5

**8.00, 10.00, 14.20** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/4 фіналу. Матч у адказ.
**12.00** Авертайм.
**12.30, 15.50** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/4 фіналу. Матчы ў адказ. Агляд.
**13.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Лёсаванне.
**13.30** «На шляху да ЧС-2018». Відэачасопіс.
**14.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Лёсаванне.
**16.25** Піт-стоп.
**17.00** Дзюдо. Чэмпіянат Еўропы.
**18.50** Хакей. Еўравыклік. Беларусь — Швецыя. (У перапынках — PRO спорт. Навіны.)
**21.05** Дзюдо. Чэмпіянат Еўропы.
**22.00** Баскетбол. Еўраліга. 1/4 фіналу. Другі матч. «Рэал» (Іспанія) — «Дарушафака» (Турцыя). (У перапынку — PRO спорт. Навіны.)

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.15** «Смак».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15, 16.20** «Час пакажа».
**16.20 Маст. фільм «Па галоўнай вуліцы з аркестрам».**
**18.20** «Кантрольная закупка».
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05 Маст. фільм «Рубін у імгле».*****
**22.50** «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі».
**0.00** «Вячэрні Ургант».
**0.40** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.05** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40, 23.55 «Важняк. Гульня навылет». Серыял.**
**12.30, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Дзіўная справа».
**15.35** «У нас усе дома».
**16.50** «Аўтапанарама».
**17.10** «Адкрытая размова».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Цана цывілізацыі».
**22.00** «Глядзець усім!»
**1.30** «Засакрэчаныя спісы. Самыя гіблыя месцы на планеце».

### МІР

**6.30, 5.05** М/ф.0
**7.30** Добрай раніцы, свет!***
**9.00 Маст. фільм «Школьны вальс».***
**10.50 Маст. фільм «Дыягназ: каханне».*****
**12.30** «Любімыя акцёры». Маргарыта Церахава.*
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** Дак. фільм «Сямейныя драмы».***
**16.15** «Сакрэтныя матэрыялы».***
**17.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».*****
**19.20 Серыял «Каханне са зброяй».*****
**23.00 Маст. фільм «Вій».***
**0.25** «Трымайся, шоўбіз!»***
**0.55** «Я — валанцёр».*
**1.30 Маст. фільм «Жаніцьба Бальзамінава».***
**2.55 Маст. фільм «Лятучая мыш».***



### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.20** «Пакой смеху».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Скліфасоўскі».**
**19.15, 20.40 Серыял «Асабовая справа».**
**22.00, 23.10** «Гумарына».
**0.10 Маст. фільм «Простая дзяўчынка».***

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.05** «Ежа без правіл».0
**7.10, 8.05 Серыял «Час Волкава».*****
**8.55 Серыял «Мухтар. Новы след».*****
**9.45, 23.10** «НЗ.by».
**10.20 Серыял «Ляснік».*****
**12.00** Суд прысяжных.***
**13.25, 16.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05** «Месца сустрэчы».
**17.05, 19.45 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».*****
**21.25 Серыял «Траса смерці».*****
**23.30 Серыял «Шэф».*****
**0.20** «Дэмбелі. Гісторыі салдацкага жыцця». Сяргей Пускепаліс.

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**10.45** «Сябры Дзядулі Марка».
**11.00 Баявік «Чалавек з залатым пісталетам».**
**13.00, 19.25 Серыял «Каралеўства».**
**14.30 Серыял «Прыгоды маладога Індзіяны Джонс».**
**16.00, 19.20, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.05** «Мультпарад». «Браты Грым».
**16.30** «Адшукваецца адпачынак».
**17.00 Серыял «Каўчэг».**
**18.35 Серыял «Агент Картэр».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Прыгоды «Пляж».**
**23.10 Серыял «Ведзьмы Усходняга ўзбярэжжа».**

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**6.30, 3.25** М/ф «Тры каты».
**6.50, 3.45** М/ф «Фіксікі».
**7.10, 4.05** М/ф «Маша і Мядзведзь».
**7.30, 4.25** «Ералаш».
**8.30** Серыял «Сямейны бізнес».
**9.30** Фэнтэзі «Вікінгі супраць прышэльцаў».
**11.40** Скетч-шоу «6 кадраў».
**12.00, 5.10** Серыял «Я лячу».
**13.00** «Лаві момант».
**13.30, 20.00, 1.50** «Уральскія пельмені».
**14.00** Серыял «Кухня-5».
**15.10** Серыял «Маладзёжка-4».
**16.20** Серыял «Татавы дочкі».
**16.50** Серыял «Закрытая школа-2».
**18.00** «Узважаныя людзі».
**21.20** Драма «Авіятар».
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка».
**2.40** «Не можа быць!»

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.45** Навіны культуры.
**10.20** Шэдэўры старога кіно. «Па законе». Маст. фільм.
**11.35** «Ядзерная любоў». Дак. фільм.
**12.30** «Пісьмы з правінцыі». Зубцоў (Цвярская вобласць).
**13.00** «Чалавек эры Кольца. Іван Яфрэмаў». Дак. фільм.
**13.40** «Жанчыны, якім пашанцавала». Маст. фільм.
**15.10** Сведкі часу. «Заслужаны гультай Расійскай Федэрацыі. Валерый Сіроўскі». Дак. серыял.
**15.40** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**16.20** «Царская ложа».
**17.05** «Энігма. Канчэта Тамайна».
**17.50** Да юбілею Міхаіла Плятнёва. Расійскі нацыянальны аркестр. Д. Шастаковіч. Сімфонія № 10.
**18.50** Колер часу. Эдуард Мане. «Бар у Фолі-Бержэр».
**19.00** Смеханастальгія.
**19.45, 1.55** «Шукальнікі». «Легенда пра Старасціна».
**20.35** Да юбілею Святланы Немаляевай. «Больш чым каханне». Святлана Немаляева і Аляксандр Лазараў.
**21.10** «Прапаную руку і сэрца». Маст. фільм.
**22.35** «Лінія жыцця». Уладзімір Васільеў.
**0.00** Мастсавет.
**0.05** «Культ кіно». «Заслона». Маст. фільм.***
**2.40** Сусветныя скарбы.

### Настальгія

**6.00** «Спяем, сябры!» з Наталляй Казялковай. 2005 год.***
**6.55, 8.45, 9.40, 11.00, 12.55, 14.45, 15.40, 17.00, 18.55, 21.40, 23.00, 1.00, 2.35, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.30, 13.30, 1.30** Маст. фільм «12 крэслаў».***
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».*
**10.00, 16.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».*
**12.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «The Beatles». 2005 год.***
**18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1965. 1-я частка. 2009 год.***
**19.15** Дак. фільм «Сумленны фатограф».*
**19.30** Тэлеспектакль «Як важна быць сур'ёзным».***
**22.00** «Колба часу».***
**0.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Праўда пра «Праўду».***

### EuroSport 1

**4.00, 6.30, 11.00, 1.05** Веласпорт. «Альпійскі тур».
**5.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**5.30** Веласпорт. «Тур Харватыі».
**7.30, 13.45, 15.00, 19.30, 21.00, 0.00, 2.30** Снукер. Чэмпіянат свету.
**9.30** Веласпорт. Парыж — Рубэ.
**12.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**12.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Лёсаванне.
**13.00, 2.00** Футбол. «ФІФА».
**13.30** Футбол. Ліга Еўропы. Лёсаванне.

### Кінакамедыя

**0.30** Камедыя «Кур'ер».***
**2.15** Фэнтэзі «Паляванне на монстра».*
**4.15, 14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».***
**5.25** Камедыя «Бясстрашная гіена-2».*
**7.05** Меладрама «Персанаж».*
**9.05** Меладрама «Па той бок».***
**11.00** Камедыя «Памятаю — не памятаю».*
**12.25** Камедыя «Няголены нянь».***
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».***
**16.15** Камедыя «Сямейка Ады».***
**17.55** Камедыя «Калачы».***
**19.30** Камедыя «Як снег на галаву».***
**21.15** Меладрама «Мой самы страшны кашмар».***
**23.00** Камедыя «Оскар».*

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.05** «Ёсць адзін сакрэт».
**8.30** «Доктар I...»
**9.00** «Вузел лёсу». Серыял.
**10.30, 2.35** «Судовыя страсці». Серыял.
**12.10** «Сляпая».
**13.10** «Варажбітка».
**14.15** «Паралельны свет».
**15.10** «Вайна нявест».
**15.40** «Здзелка».
**16.15, 4.05** «Рыжыя».
**17.10** «Людзі пятніцы».
**18.10, 1.45** «Бітва салонаў».
**19.10, 0.55** «Амерыканскі жаніх».
**20.10** «Копы ў спадніцах». Камедыя.***
**22.15** «Апакаліпсіс».
**23.10** «Ліга выдатных джэнтльменаў». Фэнтэзі.***

### ТБ1000

**8.10 11**:14.***
**9.50** Пераправа-2.***
**12.20** Шчаслівчык Гілмар.*
**14.05** Воблачны атлас.****
**17.20** Піяніст.***
**20.10** Тату зноў 17.***
**22.10** Баец.***
**0.25** Неверагоднае падарожжа містара Співета.*
**2.25** Хлусня дзеля выратавання.***
**4.15** Дзяўчына з вады.***

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Няўлоўныя: Бангкок.***
**8.05** Ваўкадаў.***
**10.50** Заказ на аднаго.*
**12.30** Паляванне на аднарога.***
**14.20** Сёстры.***
**16.10** Прывітанне ад Кацюшы.*
**20.20** # пойдземукіноАксана. Стылягі.***
**23.00** Карпаратыў.***
**0.55** Перакладчык.***
**2.20** Фатальныя яйкі.***
**4.35** Іван.

### National Geographic

**6.00, 13.10, 20.15** Гульні розуму.*
**6.55** Навуковыя недарэчнасці.*
**7.45, 10.50, 14.45** Мегазаводы.*
**8.35, 15.30** Шаша праз пекла.*
**9.20** Аўта-SOS.*
**10.05** Уварванне на Зямлю.*
**11.40, 16.15, 19.25, 2.40** Расследаванні авіякатастроф.*
**12.25, 18.40, 21.45, 1.45, 5.10** Пачатак.*
**17.50, 21.00, 1.00, 4.20** Марс.*
**22.35** Асабліва строгі рэжым.***
**23.20** Непакорныя акіяны.****

### Discovery

**8.00, 14.00** Залатая ліхаманка.***
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?*
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?*
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Склады.*
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Бітвы за кантэйнеры.*
**11.00** Ідрыс Эльба: баец.***
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.*
**18.00** Зніклае золата.*
**19.00** Бітвы робатаў.*
**20.00** Тэхнагеніка.*
**0.00, 3.50** Выжыць любой цаной.*
**1.00, 6.20** Мегаперавозкі.*
**2.00, 4.40** Маланкавыя катастрофы.***




## Небяспечная нумізматыка

...Прыехаў я аднойчы ў сталіцу — сесію здаваць, пасяліўся ў знаёмай бабулькі. І вось сядзім мы неяк, гарбату з пячэннем п'ём... Захацелася пра нешта паразмаўляць. Мне найбліжэй была тэма нумізматыкі.

Бабульку яна не дужа цікавіла, але ж варта было назваць кошты на асобныя з манет (у залежнасці ад года выпуску), як вочы яе загарэліся, а шчокі яўна паружавелі. Не даслухаўшы сказ, гаспадынька падалася ў спальню, нечым пашамацела і вярнулася ў пакой са старым, папяровым пакетам. «Дзесяць па пяць кап.», — прачытаў я на ім.

— Гэта мой муж-нябожчык прынёс, калі ў банку працаваў, — прамовіла жанчына.

Пачырванеўшы яшчэ больш, яна стала адкрываць пакунак з надзеяй, відаць, на хуткі прыбытак. Аднак чым бліжэй былі тыя манеты, тым больш... ненатуральнай чырвань — у яе на твары, на руках, цыраце.

— Апчхі! — гучна выдала бабуля.

Перад ёй ляжалі не манеты, а нейкія жэтончыкі-галышы ў банкаўскай нязмыўнай фарбе. Фарба была і на ёй самой. Спрацавала, трэба разумець, так званая банкаўская пастка — супраць злачынцаў.

Спрабуючы «зняць» яе (змыць пад кранам), бабулька запэцкала мыйку, нейкі посуд, любімы ручнік...

Мне ўсяго было шкада, а найболей — бабулю. Так што тэму нумізматыкі мы з ёй больш не падымалі.

А фарба, між іншым, з рук і твару сышла. Тыдні праз два.

**Максім Шастакоў,**

*г. Гомель.*

## Нічога святога. Толькі... бізнес?

Гэту гісторыю гадоў з восем таму расказваў мой сват. Бажыўся, што праўда.

Хлопец адзін (назавём яго Мар'янам) пасля службы ў Пскоўскай дэсантнай дывізіі задумаўся, куды б уладкавацца на працу. Складанасць была ў тым, што сціплыя заробкі ў вёсцы яго, вядома ж, не цікавілі, а па вялікія ў вялікі горад не пускалі бацькі: ім самім ужо цяжка было правіць гаспадарку. Таму хлопец падаўся ў свой райцэнтр, уладкаваўся там у міліцыю і, як здавалася, не прагадаў, бо, прыстаўлены дзяжурыць у банку, ён прыглядзеў там прыгожанькую касірку ды ў хуткім часе прыбіўся да яе ў прымы, у вялікі прыватны дом з ладным кавалкам зямлі.

І «ў шакаладзе» жыў бы, калі б жонка яго не лічыла на працы грошы — досыць вялікія і, на жаль, не свае, калі б не даводзіла мужу (асабліва як дзеці пайшлі), што яго больш талковыя калегі ўжо на машыны сабе зарабілі, а ён, як той дурань, на акладзе голым сядзіць...

Марыку і самому гэта не падабалася, але што ты будзеш рабіць?

«План дзеяннняў» выспеў выпадкова. Цешча неяк прабалбаталася, што да іх у бальніцу (яна там кастэлянкай працавала) паступіла дачка галоўнага міліцэйскага начальніка. І ледзьве жывая, бедная, бо, дурніца, дагаладалася да таго, што зараз ледзь не праз трубачку будуць карміць.

«А ёй жа можна дапамагчы, — скеміў тады Марык. — І тым самым дагадзіць — і начальству, і сабе». На матацыкле ён крутнуўся да бацькі на пасеку і прывёз адтуль найлепшага мёду.

Не ўяўляў, як яго аддаць...

І сапраўды — цяжкавата прыйшлося, бо падпалкоўнік у бок сяржанта з нейкі клункам і глядзець не хацеў.

Але ж Марык не маўчаў: казаў, што гэты мёд — дапаможа, што дачка паправіцца. І палкоўнік, як ні касавурыўся, а слоік узяў: чаго не зробіш для свайго дзіцяці.

Што там дапамагло, невядома, але дачка яго акрыяла, нават — як цешча данесла — паправілася на шэсць кілаграмаў! А Марык пасля гэтага стаў працаваць у ДАІ, інспектарам. Цяпер на службовай машыне і вольнай птушкай ён гойсаў па райцэнтры і штрафаваў усіх і за ўсё...

З часам, праўда, паспакайнеў — на нейкія правіны стаў вочы заплюшчваць (не за так, вядома ж). І раздабрэў — «вырас» і ўшыркі, і ў бакі... Калегі сталі зваць яго «пузам», аўтамабілісты — «трыбухом», а цешча — выключна — «Адамавіч», бо здабытчык жа: унукаў за грошы вучыць, жыллё ім у Мінску прыдбаў...

Адно толькі азмрочвала жыццё Мар'яна: мянялася начальства, па-новаму «мяло» і яго, здавалася, вось-вось можа «вымесці». На валаску трымаўся — клопатам патрэбных людзей. А заадно — «шлях да адступлення» рыхтаваў: з бацькавай сялібы аграсядзібу рабіў, і днём і ноччу думаў, чым бы турыстаў туды завабіць. Цішынёй, рыбалкай ці грыбамі? Мала... Усё часцей і часцей ён успамінаў, як салдатам ездзіў у Міхайлаўскае на магілу Пушкіна, якія натоўпы людзей там пракручваліся, колькі грошай, відаць, пакідалі...

Нешта падобнае, па чутках, магло б атрымацца і тут. Быў адзін знакаміты зямляк. І казалі, што прасіўся, каб пахавалі яго на радзіме, па праваслаўных могілках.

Трэба сказаць, што яны, каталіцкія і праваслаўныя, месціліся паміж дзвюма вялікімі вёскамі і ад часоў перабудовы разрасліся так, што «разрыву» паміж імі амаль не засталося. А таму ў Мар'янаву галаву прыйшла «геніяльная» бізнес-ідэя: пахаваць славутага земляка сярод каталікоў, бліжэй да ўласнага хутара. «Нябожчыку ж усё роўна, — разважаў ён, — а для мяне яго магіла будзе, што клубніца на торце!»

Зямляк той старым быў і, на жаль, адзінокім, так што смерці яго Мар'ян прычакаў. Потым падмітусіўся, каб менавіта яму даверылі сустрэць жалобны картэж і з мігалкай правесці да патрэбнай свежай магілы.

(Трэба сказаць, што было іх дзве: адну — на праваслаўнай частцы могілак — па камандзе старшыні сельсавета выкапалі мясцовыя далакопы, другую — бліжэй да Мар'янавай сядзібы — цішком «зварганілі» два байкеры, якіх даўно ўжо трэба было пазбавіць правоў.)

Менавіта да гэтай, апошняй магілы, ледзьве жывы ад страху, і «вёў» Мар'ян нетаропкую жалобную працэсію...

Першым непарадак заўважыў старшыня сельсавета: ускочыў у свой «жыгулёк» і памчаў выпраўляць сітуацыю. Мар'ян «уключыў» быў дурня: то казаў, што выконваў загад, то — што выпадкова збліытаў...

Факт, што ўрэшце пахаванне адбылося, — і належным чынам, і ў належным месцы.

Пра тое, дзе яно магло адбыцца, умомант дазналася раённае начальства. І заступацца за Мар'яна ніхто не захацеў.

Такім вось чынам скончылася яго кар'ера, а потым і жыццё, бо ўладкаваўшы аграсядзібу, дарваўся ён да дармавой гарэлкі...

Бог і сапраўды, відаць, не цяля — бачыць круцеля.

**А. Васілевіч,**

*г. Мінск.*

## Галоўнае — добра схаваць

Дзіцячыя гады — хай паўгалодныя, але ўспамінаюцца цёпла. Мабыць, таму, што там была мама (яшчэ жывая!), там былі тата, які ведаў проста безліч розных гісторый, і, калі пачынаў расказваць, мужыкі аж заходзіліся ад рогату...

Я, малая, часам не разумела: а з чаго яны так смяюцца?

Зараз жа адну з гісторый паспрабую расказаць сама.

Значыць, некалі на Гарадзеншчыне, адкуль я родам, людзі гналі добры самагон — не нейкую там сівуху, а хлебны, чысты — ну што сляза! (Многім жанкам ён слязьмі і выліваўся, але ж гісторыя пакуль не пра іх.)

...Тая сямейка на ўскрайку лесу жыла, на хутары. Зямлі пры ім не так шмат было, але ж і яе без коніка, без дапамогі людзей не дужа абробіш.

Вось і вырашыў Ясь выгнаць самагонкі. Падумаў, што ёй і наймітаў прасцей зацікавіць, і гасцей пачаставаць — балазе сынок нарадзіўся, хутка хрэсьбіны можна спраўляць...

Заквасілі яны з жонкай брагу, пачакалі, пакуль выхадзіцца, а далей. Ясь з запечка выкаціў цэбар, прыладзіў да яго змеявік-халадзільнік. Толькі-толькі разагрэў, дачакаўся першачку, як суседка ў хату:

— Яська, ратуйся! — крычыць з парога. — У Панаса ўчастковы з упраўляючым... Кажуць, трэсці будуць — гарэлку шукаць.

Гаспадар ад гэтых слоў аж спалатнеў. Тут як кінуўся разбіраць прылады... А вось куды іх схаваць? Гэта ж не іголка...

Каго іншага ў падобнай сітуацыі, можа, і «заклініла б». Яся ж — наадварот. Ён, бедны, хударлявы быў і высокі як жэрдзь, то змеявік (трубку такую, змяёй сагнутую) прыладзіў на сябе — наверх нацягнуў шаравары, на плечы ўскінуў шырокую світку — парадак. У калыску, што вісела пад столлю, схаваў пяршак. Горш за ўсё было з брагай, бо цэбар жа пад печ не падсунеш...

Ідэю жонка падала: наверх ускінула накрыўку і села, схаваўшы ўсё пад сваёй спадніцай.

(Пад той, што носяць цяперашнія жанкі, мусіць, нічога не схаваў бы? А тады і сукні, і андаракі аж да пятак былі, шырокія...)

Старэйшы сынок іх таксама без справы не сядзеў: вокны-дзверы парасчыняў, каб пах гарэлкі выветрыўся.

А тут, глядзіш, і «госці» ўжо.

Участковы (яго ж не падманеш) адразу да Яся: маўляў, сам пакажаш, дзе што стаіць, ці будзем вобыск рабіць?

— А што вам, паночкі, паказваць? — «не разумее» гаспадар.

— Ды тое, чым займаўся... Па вярсту чуваць... Так што не адбрэшашся... А не сам, дык сынок твой раскажа. Ён жа хлусіць не будзе? Малы яшчэ.

І ўжо да дзіцяці:

— Ну, скажы, малец, чым тут татка з мамкай займаліся? Што рабілі? Што дзе схавалі?

Ну малы і выпаліў:

— Тое, у чым зачынялі, — у мамкі пад спадніцай, тое, чым татка рабіў, — у яго ў портках, а тое, што атрымалася, — у калысцы ляжыць. Вунь, дзядзечка, пад столлю...

І такі ён задаволены, што добра адказаў і нават паказаў, што ўчастковы паглядзеў на калыску, для прыліку зазірнуў у каморку, потым плюнуў са злосці, ды пайшоў на двор.

...Байка гэта ці чыстая праўда, ручацца не буду. За што купіла, як той казаў, за тое і прадала.

**Галіна Нічыпаровіч,**

*в. Магільна, Уздзенскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.** *dounar@zviazda.by*



### Совместное открытое акционерное общество «Минск-Лада»

220024, г. Минск, ул. Серова, д. 1, каб. 302
УНП 100003417, ОКПО 00232992, ОКЭД 45111

**Годовой отчет за 2016 год**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС**

на 31 декабря 2016

*Единица измерения: тыс. руб.*

| Активы | Код строки | 31 декабря 2016 г. | 31 декабря 2015 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 4 262 | 4 150 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | 8 | 9 |
| В том числе: инвестиционная недвижимость | 131 | 8 | 9 |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 1 | 17 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 775 | 775 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **5 046** | **4 951** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 8 226 | 3 668 |
| В том числе: материалы | 211 | 252 | 186 |
| готовая продукция и товары | 214 | 7 922 | 3 482 |
| товары отгруженные | 215 | 52 | – |
| Расходы будущих периодов | 230 | 20 | 30 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 124 | 66 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 1 064 | 1 361 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | | 319 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 5 277 | 6 897 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **14 711** | **12 341** |
| **БАЛАНС** | **300** | **19 757** | **17 292** |
| **Собственный капитал и обязательства** | **Код строки** | **31 декабря 2016 г.** | **31 декабря 2015 г.** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 30 | 30 |
| Резервный капитал | 440 | 5 | 5 |
| Добавочный капитал | 450 | 3 896 | 3 896 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 12 505 | 11 647 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **16 436** | **15 578** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 3 321 | 1 714 |
| В том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 1 958 | 65 |
| по авансам полученным | 632 | 195 | 96 |
| по налогам и сборам | 633 | 1 025 | 1 392 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 12 | 13 |
| по оплате труда | 635 | 124 | 135 |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | 2 | 2 |
| прочим кредиторам | 638 | 5 | 11 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **3 321** | **1 714** |
| **БАЛАНС** | **700** | **19 757** | **17 292** |

***Примечание:*** *отсутствующие сроки имеют нулевые значения.*

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**

за январь – декабрь 2016 год

*Единица измерения: тыс. руб.*

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2016 года | За январь – декабрь 2015 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 39 667 | 35 436 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (35 615) | (28 468) |
| Валовая прибыль (010 – 020) | 030 | 4 052 | 6 968 |
| Управленческие расходы | 040 | (2 359) | (2 454) |
| Расходы на реализацию | 050 | (1 234) | (1 503) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050) | 060 | 459 | 3 011 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 1 792 | 1 078 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (1 929) | (1 299) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080) | 090 | 322 | 2 790 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 1 080 | 968 |
| В том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 99 | 16 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | 5 | 4 |
| проценты к получению | 103 | 952 | 930 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 24 | 18 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (91) | (16) |
| В том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (87) | (14) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | (4) | (2) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 425 | 867 |
| В том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 425 | 835 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | - | 32 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (597) | (423) |
| В том числе: проценты к уплате | 131 | - | - |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (597) | (422) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | - | (1) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100 – 110 + 120 – 130) | 140 | 817 | 1 396 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140) | 150 | 1 139 | 4 186 |
| Налог на прибыль | 160 | (281) | (835) |
| Чистая прибыль (убыток) (± 150 – 160 ± 170 ± 180 – 190 – 200) | 210 | 858 | 3 351 |
| Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230) | 240 | 858 | 3 351 |

***Примечание:*** *отсутствующие сроки имеют нулевые значения.*

**Информация о деятельности СОАО «Минск-Лада»**

Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %): 0.

Информация о дивидендах и акциях:

| Показатель | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 443 | 444 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 1 | 2 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 1 | 1 |
| в том числе: физических лиц | лиц | 442 | 442 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 0 | 0 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 0,00 | 0,00 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 0,00 | 0,00 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0,000000 | 0,000000 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0,000000 | 0,000000 |
| Период, за который выплачивались дивиденды | месяц, квартал, год | - | - |
| Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов | число, месяц, год | - | - |
| Срок (сроки) выплаты дивидендов | число, месяц, год | - | - |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 1092,00 | 1035,00 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | штук | 0 | 0 |
| **Среднесписочная численность работающих** | человек | 140 | 158 |

Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг: оптовая торговля легковыми автомобилями – 56,7%, розничная торговля легковыми автомобилями – 30,5%.

Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год: 30 марта 2017 года.

Сведения о применении эмитентом правил корпоративного поведения: используется при разработке локальных правовых нормативных актов.

Адрес официального сайта СОАО «Минск-Лада» в глобальной компьютерной сети Интернет: minsk-lada.by.

